№ 4 (554) 31 студзеня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Няма чалавека — няма праблемы

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусьціла кнігу з цэнзурай — з фатаздымку мастакоў «зьнік» Алесь Марачкін. У 37-м гэта б азначала, што я расстраляны, кажа мастак.







Упершыню гэты здымак Уладзімера Шубы друкаваўся ў 1993 г. у газэце «Советская Белоруссия». На ім — мастакі Ўладзімер Тоўсьцік, Уладзімер Савіч, Мікола Селяшчук, Уладзімер Басалыга, Гаўрыла Вашчанка, Алесь Марачкін, Леанід Шчамялёў ды Ўладзімер Зінкевіч, ляўрэаты прэміі «Чалавек году».

У 2008 г. той самы здымак зьявіўся ў кнізе «Мікола Селяшчук. Гучаньне музыкі нябёсаў», але ўжо без Алеся Марачкіна. **Старонка 3.**

## У НУМАРЫ

**Дэвід Крэймэр аб вызваленьні Дашкевіча: «Думаю, што гэта пачатак працэсу»**

На думку амэрыканскага дыплямата, ЗША «трапілі ў кропку» санкцыямі супраць «Белнафтахіму». **Старонка 9.**

**Зьміцер Дашкевіч**

«Генэралы КДБ хацелі, каб я застаўся ў Амэрыцы». **Старонка 10.**

**Польская мытня страйкавала па-італьянску**

Польская мытня наладзіла страйк, дабіваючыся большых заробкаў. У знак пратэсту кіроўцы трэйлераў перакрылі дарогі на мяжы, утварыліся 60-кілямэтровыя чэргі. Беларусь падае на Польшчу ў міжнародны суд. **Старонка 4.**

**Дэпутат Здановіч: «Нашу Ніву» і ARCHE не забароняць»**

«Цяжка прадказаць усе наступствы закону, але мы пішам яго зыходзячы з думкі, што нельга чалавеку забараніць размаўляць і пісаць на той мове, на якой ён хоча». **Старонка 6.**

**Правадыры ўсіх краінаў**

Ніводная дыктатура яшчэ не вырашала праблемаў, якія ляжалі перад краінай і нацыяй у момант прыходу да ўлады дыктатара. Піша Віталь Тарас. **Старонка 12.**

# Нашаніўцы ў Верхнядзьвінску, Гарадку і Віцебску

**9 лютага** рэдактар часопісу ARCHE і Наталка Бабіна наведаюць **Верхнядзьвінск**. **Пачатак сустрэчы ў 11.00**, даведкі па т.: (029) 518-74-19 (Валянціна). **У той самы дзень** пройдуць сустрэчы **ў Гарадку** (**пачатак а 15-й**, даведкі па т.: (029) 672-38-42 (Леанід) і **ў Віцебску** (**пачатак а 19-й**, даведкі па т. (029) 323-98-46 (Віталь). У Гарадку і Віцебску да Булгакава і Бабінай далучыцца Ўладзімер Арлоў.

## IN MEMORIAM

# Кастусь Акула

29 студзеня ў Таронта памёр вядомы літаратар і грамадзкі дзеяч, ганаровы сябар Саюзу беларускіх пісьменьнікаў і Беларускага ПЭН-цэнтру Кастусь Акула.



Кастусь Акула быў для мяне адным з увасабленьняў нашай эміграцыі — той, якая, на паўстагодзьдзя адарваная ад Бацькаўшчыны, захоўвала мову, культуру, незалежніцкія ідэі. Наша знаёмства са спадаром Кастусём пачалося ў сярэдзіне 1980-х, калі да маіх рук патрапілі ягоная кніжка «Ўсякая ўсячына», а таксама часопіс «Зважай», які Акула больш за дваццаць гадоў выдаваў у Таронта. З тых нумароў можна было даведацца тое, аб чым нашая прэса яшчэ доўга маўчала:пра лёс беларускага дысыдэнта Міхала Кукабакі, які адкрыта пратэставаў супраць агрэсіі 1968 году ў Чэхаславаччыну, або пра колькасьць вайсковых базаў зь ядзернай зброяй, якімі была нашпігаваная Беларусь.

Уяўленьне малявала Акулу асобаю легендарнай. Досыць згадаць пра ягоную акцыю што адбылася ў 1967-м у дзень Савецкага Саюзу на ўсясьветнай выставе «Экспа-67» у Манрэалі. Эміграцыйная газэта «Новое Русское Слово» пісала тады: «Тысячы людзей сачылі за першым намесьнікам Касыгіна — Палянскім, які рабіў агляд ганаровай варты, калі з боку сэкцыі прэсы пачуўся моцны голас «Freedom for Belarus! Няхай жыве незалежная Беларусь!», адначасова адтуль паляцелі ўгору сотні брашур. Паліцэйскія схапілі чалавека, які крычаў, і заціснулі яму рот. Гэта быў беларускі пісьменьнік Кастусь Акула»... Завочнае знаёмства з Акулам атрымала працяг улетку 1992 г., калі ён зноў ступіў на родную зямлю. Мы знаёміліся бліжэй і на шумных палітычных мітынгах, і на ціхіх вуліцах майго роднага Полацку, ля сьценаў Сафійскага сабору, каля магілы Янкі Журбы на Ксавэраўскіх могілках, Спаса-Эўфрасіньнеўскім манастыры...

Кастусь Акула (ад нараджэньня Аляксадар Качан) прыйшоў на сьвет 16 лістапада 1925 году ў заходнебеларускай вёсцы Верацеі, што цяпер у Докшыцкім раёне. Бацькі — Ігнат і Паўліна — мелі, апрача Алеся, яшчэ сем дзяцей і да 12 гектараў ворнай зямлі. Кастусь вучыўся сьпярша ў пачатковай польскай школцы, а пасьля — у савецкай. У час нацысцкай акупацыі скончыў у Глыбокім 6-месяцовыя настаўніцкія курсы і паспытаў хлеб вясковага настаўніка. Увосень 1943 здаў іспыты ў апошнюю 8-ю клясу Віленскай беларускай гімназіі, але скончыць яе не пашчасьціла: падчас адной з паездак дадому трапіў у Менску ў аблаву. Вучэньне перапынілася 3 месяцамі нямецкай вязьніцы і месяцам канцлягеру.

У чэрвені 1944 ён паступіў добраахвотнікам у Менскую школу камандзіраў Беларускай Краёвай Абароны, якая афіцыйна так і не пасьпела адкрыцца. Чыгуначныя эшалёны, бамбаваньні, пешыя маршы па дарогах Эўропы. Пры канцы жніўня школа арганізавана перайшла да францускіх партызанаў. Кастусь уступіў у 8-ю брытанскую армію ў Італіі, браў удзел у баях з гітлераўцамі на Апэнінскай паўвысьпе, памяткаю аб чым засталіся ўзнагароды — ангельскі «Мэдаль за вайну» і «Зорка Італіі».

Вяртаньне на Радзіму абяцала няволю ў ГУЛАГу (там загінуў бацька пісьменьніка). Жыцьцё ў вольным сьвеце пачалося з польскай вайсковай школы ў Ангельшчыне. Пераехаўшы ў Канаду, Кастусь пасяліўся ў Таронта, маючы на мэце заснаваць беларускую нацыянальную арганізацыю. У 1948 Акулу абралі першым старшынём Згуртаваньня Беларусаў Канады.

У 1948—54 годзе ён рэдагаваў штомесяцовую газэту «Беларускі эмігрант», супрацоўнічаў з парыскім «Континентом».

У 1962 пабачыў сьвет першы раман Кастуся Акулы «Змагарныя дарогі», які ў 1994 быў перавыдадзены ў Беларусі. Некалькі месяцаў кніга займала найвышэйшыя радкі ў сьпісах айчынных бэстсэлераў, адкуль потым перавандравала ў пералік 100 найбольш папулярных беларускіх кнігаў XX ст., складзены «Нашай Нівай» на падставе чытацкіх лістоў. Раман, безь якога цяпер немагчыма ўявіць беларускую літаратуру, прысьвечаную Другой усясьветнай вайне, атрымаў літаратурную прэмію імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-Цэнтру. У 2005-м у Менску пад назваю «Россыпы» выйшаў важкі том выбранай Акулавай прозы. Пяру Кастуся Акулы належыць таксама аўтабіяграфічная трылёгія «Гараватка», публіцыстычна завостраны раман «За волю» і напісаны па-ангельску раман «Tomorrow is Yesterday («Заўтра — гэта ўчора»), дзе нямецкія нацысты і расейскія бальшавікі паказаныя аднолькава небясьпечнымі ворагамі Беларусі. Сёлета Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» выдае беларускі пераклад гэтага твору.

У адным са сваіх вершаў Кастусь Акула пісаў:

Я зганьбаваную сьвятыню,  
як мог, што сілаў, аднаўляў.  
На помач клікаў на чужыне,  
шляхі і вехі ўстанаўляў.  
І благаслаўлены Усявышні  
нас верай, сілай надзяліў, —  
народ наш на зямлі ня лішні,  
ён будзе жыць, як хваль прылїў!

Спадар Кастусь меў права сказаць так пра сябе. Ягоны нязломны аптымізм быў добрым прыкладам для беларусаў па абодва бакі акіяну. У кожным са сваіх лістоў да мяне ён заўсёды маляваў птушку ў палёце. Ягоная душа імкнулася на Радзіму. Няхай ёй будзе ўтульна там, у нябеснай Беларусі!

**Уладзімер Арлоў**

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Бывай, рынкавы сацыялізм

«Сёньня ідзе перакос у галіне зарплаты. Пры яе наліччэньні карыстаемся нарматывамі савецкага пэрыяду. Гэта нас не задавальняе», — заявіў на мінулым тыдні прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі. Яго падтрымаў уплывовы старшыня Нацбанку Пятро Пракаповіч: «Сыстэма аплаты працы ў нас прадугледжвае зраўняйлаўку».

Чыноўнікі вырашылі пайсьці на экспэрымэнт спачатку ў будаўнічай галіне: тут нізкія, нягнуткія заробкі прывялі ў апошнія гады да масавага адплыву кваліфікаваных кадраў.

Дагэтуль павышаць заробкі ў краіне можна было толькі па меры росту тарыфнай стаўкі першага разраду, а памер прэмій і даплатаў таксама лімітаваўся.

Права павышэньня заробкаў, найперш сабе, даўно дабіваўся дырэктарат і віцэ-прэм'ер Сямашка, які выказвае ягоныя інтарэсы.

На практыцы адыход ад савецкага прынцыпу наліччэньня заробкаў будзе таксама непазьбежна азначаць рост сацыяльнай няроўнасьці. Беларуская адміністрацыя ўсё сьмялей бярэ курс на пабудову аўтарытарнага капіталізму тыпу таго, што існаваў ці існуе ў некаторых краінах Азіі і Лацінскай Амэрыкі. Зьмяняецца ўсё: ад гатэляў праз сыстэму льготаў да сыстэмы пакараньняў. Заўтра мы будзем жыць у іншай — але ўсё яшчэ аўтарытарнай — краіне.

# Алесь Марачкін: У 37-м гэта б азначала, што я расстраляны

«Мастацкая літаратура» выпусьціла кнігу «Мікола Селяшчук. Гучаньне музыкі нябёсаў» з цэнзурай — з групавога фатаздымку мастакоў «зьнік» Алесь Марачкін.


KP.PU

Упершыню гэты здымак Уладзімера Шубы друкаваўся ў 1993 г. у газэце «Советская Белоруссия». На ім — мастакі Ўладзімер Тоўсьцік, Уладзімер Савіч, Мікола Селяшчук, Уладзімер Басалыга, Гаўрыла Вашчанка, Алесь Марачкін, Леанід Шчамялёў ды Ўладзімер Зінкевіч, ляўрэаты прэміі «Чалавек году».

У 2008 г. той самы здымак зьявіўся ў кнізе «Мікола Селяшчук. Гучаньне музыкі нябёсаў», але ўжо без Алеся Марачкіна.

Мастак пракамэнтаваў выпадак з цэнзурай наступным чынам: «У 37-м годзе зьнікненьне пэўнай асобы з партрэту, ці здымка магло б азначаць, што яго расстралялі. Натальля Шаранговіч, што ўкладала кнігу пра Селешчука — няўжо яна думала, што нехта не заўважыць цэнзуры? Магла ж не пусьціць такі здымак, але пусьціла. І цяпер яна, а таксама людзі, што разам зь ёй рабілі кнігу, цалкам нясуць адказнасьць за гэты падман».

Укладальніца кнігі Натальля Шаранговіч паведаміла, што ўпершыню чуе пра здарэньне з фатаздымкам: «Я адказвала толькі за тэкставую частку», — цьвердзіць яна. А хто ж адказваў за фатаздымкі? Па яе словах, гэта мастацкі рэдактар кнігі Маргарыта Шкурпіт, і яна ўжо некалькі месяцаў як не працуе ў выдавецтве.

«У дадзеным выпадку найперш парушаны Закон аб аўтарскіх і сумежных правах. Эпізод са зьнікненьнем Алеся Марачкіна з фотаздымка — гэта відавочнае ўмяшаньне ў творчую дзейнасьць фатографа, аўтара здымка, — камэнтуе сытуацыю юрыст Андрэй Бастунец. — Трэба гаварыць і пра парушэньне шэрагу артыкулаў Закону ад друку, калі выдавецтва «выправіла» здымак, ці разьмясьціла яго ў такім выглядзе пад вонкавым ціскам. У прыватнасьці, парушаны артыкул 4, які гаворыць пра недапушчальнасьць цэнзуры і артыкул 48, які забараняе парушэньне прафэсійнай самастойнасьці рэдакцыі».

Алесь Марачкін зьбіраецца склікаць сэкцыю мастацтвазнаўства Саюзу мастакоў, каб абмеркаваць здарэньне. «У сераду меў непрыемную размову з Васілём Шаранговічам — той, заступаючыся за дачку, нават пагражаў, казаў, што я ня ведаю, каго зачапіў» — паведаміў ён. Сп. Марачкін застаецца пры ранейшым меркаваньні наконт адказнасьці рэдактараў выданьня і яго ўкладальніка: «У кнізе пазначана, што Натальля Шаранговіч — укладальнік выданьня, а ня толькі тэкставай часткі. Адказнасьць нясуць і рэдактары — Віктар Шніп, Віктар Праўдзін ды Уладзімер Мачульскі».

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### На кнігу Барадуліна зьбіраюць усім сьветам

Выдавецтва «Кнігазбор» абвясьціла збор сродкаў на выданьне кнігі «Выбраныя творы» Рыгора Барадуліна. Гэта чарговы том сэрыі «Беларускі кнігазбор», заплянаваны да друку сёлета. Удзел у выданьні кнігі Народнага паэта можа ўзяць кожны. Выдаўцы гэтак плянуюць зьменшыць кошт на кнігу, каб яе змагло набыць як мага болей людзей. Дырэктар «Кнігазбору» Генадзь Вінярскі паведаміў, што ўсе ахвотныя прыняць удзел у гэтай справе, могуць зьвяртацца на тэлефон выдавецкага прадпрыемства «Кнігазбор» 204-86-97.

### «Катынь» сярод намінантаў на «Оскара»

Амэрыканская кінаакадэмія абвесьціла сьпіс намінантаў на прэмію «Оскар». Фільм Анджэя Вайды «Катынь» прадстаўлены ў намінацыі «найлепшы замежны фільм» разам зь фільмамі расейскіх рэжысэраў — «12» Мікіты Міхалкова і «Мангол» Сяргея Бадрова-старэйшага.

Уручэньне «Оскараў» пройдзе 24 лютага.

### J:Mors адмовіліся ад удзелу ў «Рок-каранацыі»

Гурт J:Mors без тлумачэньня прычынаў адмовіўся браць удзел у «Рок-каранацыі», якая пройдзе 29 лютага ў КЗ «Менск». Тым часам, Менгрвыканкам даў дазвол на ўдзел у канцэрце ўсім «забароненым» музыкам — «Краме», N.R.M. і «Нэйра Дзюбелю».

# Польская мытня страйкавала па-італьянску

Польская мытня наладзіла страйк, дабіваючыся павышэньня аплаты працы. У знак пратэсту кіроўцы трэйлераў заблякавалі дарогі на мяжы, утварыліся 60-кілямэтровыя чэргі. Нягледзячы на ўрэгуляваньне сытуацыі, Беларусь падае на Польшчу ў міжнародны суд.

Праблемы на беларуска-польскай мяжы пачаліся раніцай 25 студзеня. Польскія мытнікі пашырылі сюды распачаты раней на мяжы з Украінай страйк. Яны патрабавалі ад Мінфіну Польшчы павышэньня месячнага заробку на 1.500 польскіх злотых ($600). Міністэрства пагадзілася толькі на 500 злотых ($200).

Ад пачатку страйку праз мяжу ня мелі праблемаў толькі чыгуначны, пасажырскі, турыстычны і дыпляматычны транспарт, а таксама аўто, што перавозяць небясьпечныя грузы альбо тавар, што хутка псуецца. Грузавыя пункты пропуску, напрыклад, «Казловічы», спынілі працу ўвогуле. Абодва бакі рэкамэндавалі сваім грамадзянам устрымацца ад паездак за мяжу. Спроба Дзяржаўнага мытнага камітэту Беларусі пераарыентаваць грузавыя плыні на беларуска-літоўскую мяжу ня мелі вялікага посьпеху, бо такі шлях стварае значныя праблемы з афармленьнем транспартных дакумэнтаў.

## Цяжкі панядзелак

28 студзеня сытуацыя стала ўскладняцца. Прэса паведаміла пра пагаршэньне санітарных умоваў у чарзе. У экстраным парадку на мытню наведаўся прэм'ер-міністар Польшчы Дональд Туск. У Белай Падляскай ён меў перамовы з кіраўнікамі мытнае службы. Паводле польскай газэты «Дзеньнік», прэм'ер назваў сытуацыю цяжкай і дадаў, што зацягваньне канфлікту шкодзіць усім. Паводле ягоных словаў, пратэст мытнікаў ня ёсьць фармальным страйкам, бо яны папросту не выходзяць на працу, бяруць адгулы ці бальнічныя. Туск прапанаваў мытнікам падвышэньне заробку на 500 злотых і паабяцаў хуткія зьмены ў заканадаўстве. У прыватнасьці, грошы, а ня толькі адгулы, за звышурочную працу. Мытнікаў запэўнілі, што іх не пакараюць за наступствы акцыі пратэсту. «Прымусіць мытнікаў працаваць я не магу», — расьпісаўся ў сваім бясьсільлі прэм'ер. Паводле віцэ-прэм'ера Гжэгажа Схетыны, перамовы з мытнікамі весьці складана, бо апошнія ня маюць ні страйкавага камітэту, ні выразных патрабаваньняў.

У Берасьці ў панядзелак сустракаліся прадстаўнікі памежных ведамстваў абедзьвюх краінаў. Памежнікі разважалі пра пераадоленьне наступстваў страйку. Беларускі бок чакае істотнага павелічэньня пасажырапатоку з Польшчы па заканчэньні забастоўкі, а таму рыхтуецца да павелічэньня колькасьці каналаў пропуску і выкарыстаньня мабільнага абсталяваньня для афармленьня грамадзянаў, што перасякаюць мяжу.

## На мяжы блякады

У панядзелак увечары кіраўнік Мытнай службы Яцэк Дамінік паабяцаў, што мытнікі вернуцца да працы ў абмен на абяцаньне зьменаў у заканадаўстве. Пасьля гэтага мытнікі заклікалі кіроўцаў грузавікоў вызваліць шлях для памежнікаў, якія праз блякаду дарогаў не маглі патрапіць на працу. Кіроўцы TIR-аў у сваю чаргу далі ўраду адзін дзень на перамовы з мытнікамі і паабяцалі заблякаваць шляхі на Варшаву, калі не пабачаць зьменаў.

У ноч на аўторак на розных участках мяжы пачалі працу мытныя службы. Што праўда, ня ў поўным складзе.

Раніцай у аўторак значна паменшала чарга на пераезьдзе ў Кузьніцы (зь беларускага боку — Брузгі) — да 60 грузавікоў. Уночы на гэтым участку працавала каля 80% пэрсаналу, у Беларусь праехалі каля 160 грузавікоў, удзень на працы знаходзілася да паловы службоўцаў. У суседніх Баброўніках (зь беларускага боку — Бераставіца) працавала каля 70% мытнікаў, якія афармілі да 130 аўто. У аўторак там заставалася з польскага боку каля 280 грузавікоў, колькасьць пэрсаналу не зьмянілася.

Перамовы кіраўніка мытнай службы з прадстаўнікамі ўраду мелі вынікам зьмены ў Статуце аб мытнай службе. У хуткім часе Мытную службу прыраўняюць да іншых сілавых структураў, а кар'ерны рост будзе гарантаваны не пазьней чым праз пяць гадоў працы на мытні. Мытнікам гарантавалі таксама анансаванае раней павышэньне заробку. Падазраваных у карупцыі супрацоўнікаў будуць адналяць на працы ў выпадку зьняцьця падазрэньняў. Кіраўніцтва мытнай службы заклікала сваіх супрацоўнікаў вяртацца да працы, а таксама зьвярнулася да кіроўцаў з просьбай зьняць блякаду пераездаў.

## Палітычны падтэкст

Сытуацыяй вакол страйку мытнікаў скарысталіся супернікі дзейнага прэм'ер-міністра. Прадстаўнік партыі «Права і Справядлівасьць» (Prawo i Sprawiedliwoњж) Яхім Брудзіньскі заявіў, што пратэст мытнікаў стаў вынікам некампэтэнтнасьці Дональда Туска і дзейных міністраў. Кіраўнік Саюзу дэмакратычнай лявіцы (SLD) Гжэгаж Напэральскі зьвінаваціў урад Туска




ў парушэньні перадвыбарных абяцаньняў і няздольнасьці дзейнічаць у крызісных сытуацыях.

На інтэрнэт-форумах польскіх сайтаў гучалі меркаваньні, што сытуацыя з польскімі мытнікамі мае падвойнае дно і выразную палітычную афарбоўку. «Польскія мэдыкі і мытнікі адносяцца да аднаго з самых карумпаваных сэгмэнтаў польскага рынку працы і іхныя акцыі пратэсту маюць надта дзіўную прывязку да абвастрэньня антыкарупцыйных акцыяў», — піша адзін з чытачоў «Дзеньніка». Іншы наведнік сайту выказваецца пра выкарыстаньне страйкаў палітычнымі сіламі для аслабленьня апанэнтаў. Варта нагадаць, што забастоўцы мытнікаў папярэднічалі акцыі пратэсту польскіх мэдыкаў і настаўнікаў, якія таксама патрабавалі павышэньня заробкаў.

### Цана праблемы

Беларускі бок ацэньвае страты бюджэту ад прастойваньня грузавых аўто на мяжы ў мільён даляраў штодзень. Паводле намесьніка міністра юстыцыі Беларусі Ігара Тушынскага, страты ад сутак прастою аднаго вялікагрузнага аўтамабіля складаюць амаль $300. Польскі бок ацэньвае аналягічныя страты ў 1500 злотых. Мін’юст Беларусі рыхтуецца выставіць пазовы польскім уладам наконт стратаў, панесеных беларускім бокам у сувязі з забастоўкай польскіх мытнікаў. Са словаў І. Тушынскага, парушаныя як мінімум тры пагадненьні Беларусі і Польшчы. Страты таксама нясе дзяржава як суб’ект міжнароднага права з прычыны таго, што Польшча не выконвае адпаведнае пагадненьне. Акрамя таго, атрымальнік грузу можа адмовіцца ад паслуг перавозчыка, і перавозчык страціць рынак, дадаў намесьнік міністра.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### Стала вядомая цана продажу Velcom

На сайце Нацбанку апублікаваныя дадзеныя плацёжнага балянсу Беларусі за студзень—верасень 2007 г. «Справаздачны пэрыяд (студзень—верасень 2007 г.) характарызаваўся значным прытокам наўпроставых інвэстыцый у выглядзе акцыянэрнага капіталу ў памеры $1 058,7 млн, што найперш зьвязана з укладаньнем замежных інвэстараў у буйныя праекты, такія, як беларуска-расейскае прадпрыемства на базе уласнасьці ААТ «Белтрансгаз» і продаж замежнаму інвэстару долі ўраду ў статутным фондзе СПТАА «Мабільная лічбавая сувязь». Паступленьні ад замежных інвэстараў па іншых аб’ектах наўпроставага інвэставаньня склалі $89,6 млн», — гаворыцца ў справаздачы Нацбанку. «Газпром» пералічыў $625 млн за 12,5% акцый «Белтрансгазу». Калі адняць гэту суму, а таксама $89,6 млн, атрыманыя ад іншых угодаў, ад агульнай сумы інвэстыцыяў, прыбытак беларускага боку ад продажу дзяржаўнай долі Velcom’у складае $344,1 млн.

Праз два месяцы пасьля продажу беларускай долі Velcom набыла аўстрыйская кампанія Telecom Austria AG. Сума ўгоды склала 1,05 млрд EUR. Адбылося гэта праз набыцьцё заснавальніка апэратара — кіпрскую SB Telecom. Гэта дазволіла беларускім уладам прадаць Velcom не выходзячы па-за рамкі нацыянальнага заканадаўства і не аб’яўляючы пры гэтым тэндэр.

### Цэмэнцярні сёлета не акцыянуюць

Прыпыненае акцыянаваньне РУП «Крычаўцэмэнтнашыфэр» і РУП «Беларускі цэмэнтны завод», што мусілі пераўтварыцца ў акцыянэрныя таварыствы ў 2007 г. У 2010 г. на кожнай з беларускіх цэмэнцярняў плянуецца ўвесьці ў эксплюатацыю лінію па вытворчасьці цэмэнту магутнасьцю 1,8 млн т кожная. Інвэстуе ў праект кітайская карпарацыя «Сітык», а таксама будуць задзейнічаныя сродкі прадпрыемстваў.

### Урад мяркуе падвысіць цану транзыту расейскіх нафтапрадуктаў

Усьлед за павышэньнем цаны транзыту нафты па беларускай тэрыторыі, урад Беларусі вырашыў узьняць плату і за транзыт нафтапрадуктаў. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, вядзецца пра павышэньне на 30%. На сёньня тарыф складае $0,89 за 1 т на 100 км. Гэты паказчык не зьмяняўся ад 2004 г. Сёлета яго плянуецца ўзьняць прыблізна да $1,2.

Нагадаем, у пачатку студзеня ўрад падтрымаў прапанову Мінэканомікі пра падвышэньне транспартнага тарыфу за транзыт расейскай нафты на 15,7—16,7%, што павінна прынесьці ў бюджэт дадатковыя $31 млн.

**СП, «Белорусские новости», АФН, БЕЛТА**

# Дэпутат Здановіч: «Нашу Ніву» і ARCHE не забароняць»



Старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе палаты прадстаўнікоў Уладзімер Здановіч, камэнтуючы ход дапрацоўкі законапраекту аб правілах беларускай артаграфіі і пунктуацыі выказаўся наступным чынам:

«Газэты, якія выкарыстоўваюць «тарашкевіцу», баяцца, што пасьля ўступленьня закону ў сілу іх пазакрываюць. Канечне, цяжка прадказваць усе наступствы закону, але мы пішам яго зыходзячы з думкі, што нельга чалавеку забараніць размаўляць і пісаць на той мове, на якой ён хоча. Калі хтосьці чытае газэту «Наша Ніва», часопіс ARCHE, дык наўрад ці іх будуць забараняць. Проста ўсе будуць ведаць, што мова гэтых выданьняў несапраўдная, неўжываная. Абмежаваць доступ да СМІ, інтэрнэту немагчыма. Мы перажываем у першую чаргу за дзяцей. Чытаючы розныя газэты, а потым здаючы тэсты, яны павінныя ведаць, як будзе пісацца тое ці іншае слова афіцыйна».

**БелаПАН**

# Жыхароў вуліцы Маркса выселяць на ўскраіны

Бліжэйшым часам жыхароў некалькіх дамоў у цэнтры Менску выселяць на сталічныя ўскраіны. Пад адсяленьне трапілі дамы № 7, 9, 19, 21А на вуліцы Маркса, а таксама дом па Валадарскага,17.

Папросту гарадзкія ўлады вырашылі стварыць у гэтым участку Менску пешаходную вуліцу. Бялізна на гаўбцах, на думку чыноўнікаў, будзе псаваць эстэтычны выгляд раёну. Разам з тым, гаворыцца і пра іншае, што на гэтым месцы разьмесьціцца гатэль, казіно і гандлёвы цэнтар. Дом па адрасе Маркса, 21А зьнясуць цалкам, а на яго месцы будзе стаянка для аўтамабіляў.

Людзям, якія раней пражывалі па гэтых адрасах, выдадуць кватэры адпаведнага мэтражу ў новых раёнах сталіцы. Пакуль невядома, дзе дакладна. Людзі абураныя і тым, што страцяць у грашах. Цана квадратнага мэтру на вуліцы Маркса складае 3700 даляраў, а, скажам, у Лошыцы толькі 1700 даляраў. Некаторыя гаспадары могуць страціць на такіх абменах больш за 100 тысяч даляраў.

Калі жыхары гэтых дамоў адмовяцца высяляцца добраахвотна, то, ня выключана, што гэта будзе адбывацца ў судовым парадку.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### Выйшаў на волю яшчэ адзін палітвязень

Прадпрымальнік з Ваўкавыску Юры Лявонаў вызвалены 25 студзеня з Баранавіцкай калёніі ўзмоцненага рэжыму. Мікалай Аўтуховіч і Юры Лявонаў, уладальнікі найбуйнейшага бізнэсу таксовак у Ваўкавыску, былі абвінавачаныя ў стварэньні схемы ўхіленьня ад падаткаў і атрымалі тэрміны пазбаўленьня волі.

18 студзеня на волю выйшаў і Мікола Аўтуховіч, яму зьмянілі меру стрыманьня на папраўчыя працы.

### Парлямэнцкія выбары 28 верасьня

Пра гэта паведаміла старшыня Цэнтравыбаркаму Лідзія Ярмошына. Адпаведна, выбарчая кампанія афіцыйна мае пачацца ў канцы чэрвеня.

### Што будзе з расейскім РЛС у Беларусі?

Расея плянуе адмовіцца ад карыстаньня радыёлякацыйнымі станцыямі (РЛС) за мяжой. Пра гэта паведаміў камандуючы Касьмічнымі войскамі Расеі Ўладзімер Папоўкін. У першую чаргу гэта датычыцца арэнды ўкраінскіх РЛС, а пасьля ўсіх «іншаземных». Рашэньне зьвязанае з тым, што « РЛС, якія знаходзяцца ў краінах былога Савецкага Саюзу, залежаць ад волі дзяржаваў — Украіны, Азэрбайджану, Казахстану, Беларусі», — заявіў Папоўкін.

### Лётчыкаў і мастакоў будуць вучыць шэсьць гадоў

Урад вызначыў сьпіс спэцыяльнасьцяў, дзе навучаньне будзе падоўжанае на год. Дакумэнт тычыцца такіх спэцыяльнасьцяў, як «Тэхнічная эксплюатацыя паветраных суднаў і рухавікоў» з кваліфікацыяй «Інжынэр», «Эксплюатацыя паветранага транспарту (франтавая авіяцыя)». «Спэцыяліст па кіраваньні», «Жывапіс» з кваліфікацыяй «Мастак-выкладчык», «Архітэктурны дызайн», а таксама кваліфікацыі «Урач. Псыхоляг у галіне аховы здароўя». Тэрмін навучаньня на гэтых спэцыяльнасьцях складзе не 4 гады або 5 гадоў, як па асноўных спэцыяльнасьцях, а 5,5 — 6 гадоў.

### Тэлемост з Папам

1 сакавіка а 18-й беларускія вернікі атрымаюць магчымасьць зьвярнуцца праз тэлемост да Папы Бенедыкта XVI. Беларуская частка мосту адбудзецца ў менскай Катэдры на Плошчы Свабоды. Ён прымеркаваны да VI Эўрапейскага дня студэнтаў унівэрсытэтаў. Акрамя Беларусі, у тэлемосьце возьме ўдзел моладзь з Румыніі, Італіі, Францыі, Гішпаніі, Вялікай Брытаніі, ЗША, Кубы, Бразыліі, Мэксыкі ды Эквадору. Трансьляцыя тэлемостаў дасяжная ўсёй Эўропе, у тым ліку праз інтэрнэт.

**ЗП, ЯС, Польскае радыё для замежжа**

# Жалезьнічэнка як Шаўчэнка

Грамадзкага актывіста з Гомеля аддалі ў салдаты.



WWW.SVABODA.ORG

22 студзеня, рэктар Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту Аляксандар Рагачоў падпісаў загад аб паўторным адлічэньні з ВНУ студэнта-выдатніка 3-га курсу матэматычнага факультэту Зьмітра Жалезьнічэнкі. Перад гэтым, 16 студзеня, суд Цэнтральнага раёну Гомеля прызнаў незаконным ягонае першае адлічэньне з ВНУ ў верасьні 2007 г.

Хлопец пабыў студэнтам менш за тыдзень. Ён зноў зьбіраўся праз суды абскарджваць выключэньне. Аднак 25 студзеня Зьмітра Жалезьнічэнку нечакана забралі служыць у чыгуначныя войскі.

У той самы дзень Зьміцер, пратэстуючы супраць адпраўкі ў войска, абвясьціў бестэрміновую галадоўку. Ён адразу паведаміў пра гэта ў прызыўную камісію і ў Мінабароны.

«Афіцэры зь ім размаўляюць па-беларуску, — гаворыць намесьнік старшыні Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, што наведаў Зьмітра ў жлобінскай в/ч №83469. — Цяпер Зьміцер шукае расейска-беларускі слоўнік вайсковых тэрмінаў, каб загады яму маглі аддаваць таксама па-беларуску. Кажа, што ўмовы абсалютна нармальныя, дзедаўшчыны няма. Бачыў у сталоўцы, што і ежа неблагая. Па некалькі разоў на дзень зь ім гутараць афіцэры, якія ўгаворваюць спыніць галадоўку. Менавіта ўгаворваюць, а не прымушаюць».

Тым часам Міністэрства абароны папярэдзіла юнака пра крымінальную адказнасьць за галадоўку. «У адпаведнасьці з артыкулам 447 Крымінальнага кодэксу ён падлягае крымінальнай адказнасьці за наўмысную шкоду свайму здароўю ў мэтах ухіленьня ад вайсковай службы. Яму будуць даведзеныя гэтыя патрабаваньні, і далей камандзірам часьці будуць рабіцца адпаведныя захады», — заявіў у інтэрвію радыё «Свабода» кіраўнік прэсцэнтру МА палкоўнік Вячаслаў Раменчык.

«Беларускае войска не запляміла сябе ў рэпрэсіўных захадах, у перасьледзе іншадумцаў, у адрозьненьні ад іншых сілавых структур. Мы б вельмі не хацелі, каб у выпадку са Зьмітром Жалезьнічэнкам беларускае войска стала саўдзельнікам гэтай рэпрэсіўнай машыны. Мы будзем прасіць Зьмітра спыніць галадоўку, ён ужо засьведчыў сваю мужнасьць, таму ставіць пад пагрозу сваю здароўе ня варта», — адзначана ў лісьце, накіраваным Партыяй БНФ на імя міністра абароны Леаніда Мальцава.

У панядзелак Зьміцер нечакана быў дастаўлены ў вайсковы клінічны цэнтар у Менску, на абсьледаваньне ў аддзяленьні кардыялёгіі. У шпіталі да яго прыставілі асобнага афіцэра, які ўсяляк абмяжоўваў кантакты хлопца.

Орган Мінабароны «Белорусская военная газета» прысьвяціла Зьмітру артыкул на першай старонцы. «Цікава, як бы паступіў спадар Жалезьнічэнка, калі б яму прапанавалі паслужыць пад бел-чырвона-белым сьцягам у Беларускай Самапомачы ў 1942—43 г.?», — пытаецца аўтар артыкулу «Дима Железниченко как зеркало несостоявшейся «васильковой революции». Побач зьмешчаная табліца з указаньнем колькасьці зьнішчаных фашыстамі жыхароў Беларусі.

30 студзеня Зьмітра Жалезьнічэнку зноў даставілі ў Жлобін, у вайсковую частку. Паводле кіраўніка прэсавай службы Міністэрства абароны Вячаслава Раменчыка, хлопец спыніў галадоўку.

**Зьміцер Панкавец**

## Анатоль Лябедзька: Парсюкі ў маіх бацькоў лепш ядуць, чым мы на Акрэсьціна

У пятніцу 25 студзеня на волю з спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна пачалі выходзіць затрыманыя падчас акцыі прадпрымальнікаў 10 студзеня.

Першым браму ізалятару пакінуў старшыня АГП Анатоль Лябедзька, за ім выйшаў яшчэ 21 чалавек.

«Нягледзячы на тое, што вязьняў пачалі выпускаць датэрмінова, падтрымаць нас прыехала багата людзей. Гэта было прыемна нават для мяне, які сядзеў тут ужо шосты ці сёмы раз. А што казаць пра маладых хлопцаў, якія апынуліся на Акрэсьціна ўпершыню. Мы дачакаліся, пакуль выйдзе апошні — Міхаіл Пашкевіч. У двары спэцпрыёмніку стаялі машыны з АМАПам, але мы ўсё адно прагукалі «Жыве Беларусь!» Праз краты ў вокнах бачылі Алеся Таўстыку і Алега Корбана», — расказвае А. Лябедзька.

Паводле словаў лідэра АГП, умовы на Акрэсьціна ад часу ягонай мінулай адсідкі не палепшыліся. «Самае страшнае — гэта холад начамі. Спаць магчыма толькі, калі апранеш трое штаноў і швэдраў, «мэтадам капусты». Колькі мае сябры і родныя спрабавалі перадаць спальнік, у іх яго не ўзялі. Нельга прыносіць і ежу. Што да турэмнага харчаваньня, то нават парсюкі ў маіх бацькоў маюць лепшы рацыён. Прыкладна кожную чацьвертую пайку я ня еў. Адзінае добрае — адрамантавалі душ. Увогуле, мы зь сябрамі пастанавілі пачаць «ачалавечваньне» Акрэсьціна. Паводле правілаў, нас павінныя выводзіць на прагулку на вуліцу, дазваляць перадаваць бялізну і г.д. Ужо зьбіраемся перадаць такі зварот у пракуратуру», — кажа палітык.

Расказаў ён і пра допыты, якія адбываліся ў спэцпрыёмніку пасьля акцыі 10 студзеня. «У суботу 12 студзеня на Акрэсьціна да нас прыехала цэлая брыгада сьледчых. Кіраваў імі начальнік сьледчага аддзелу ГУУС Мінгарвыканкаму падпалкоўнік Міхальчык. Менавіта ён і дапытваў мяне, амаль гадзіну. Расказаў, што заведзеная крымінальная справа паводле факту недазволенай вулічнай маніфэстацыі. Дапыталі і ўсіх астатніх затрыманых у той дзень. Цяпер усе мы праходзім па гэтай крымінальнай справе сьведкамі», — сказаў А. Лябедзька.

**Зьміцер Панкавец**

# Кіеў і Эўрасаюз абмеркавалі праекты пастаўкі газу з Туркмэніі праз Украіну

Кіраўнічка ўкраінскага ўраду наведалася з двухдзённым візытам у Брусэль. У часе першага візыту за мяжу ў якасьці прэм'ер–міністра яна ініцыявала перагляд дамовы з Расеяй аб пастаўках газу ва Ўкраіну і прапанавала пабудову газаправоду з Туркмэністану ў Эўропу праз Украіну.

У панядзелак Юлія Цімашэнка сустрэлася з прэзыдэнтам Эўракамісіі Жазэ Мануэлем Барозу, камісарам у пытаньнях энэргетыкі Андрысам Пібалгсам і каардынатарам ЭС у пытаньнях разьвіцьця паўднёвых праектаў газаправодаў Ёзісам Ёганэсам ван Аартсэнам.

У аўторак Ю. Цімашэнка сустракалася зь вярхоўным прадстаўніком Эўрасаюзу па замежнай палітыцы і бясьпецы Хаўерам Салянам.

Юлія Цімашэнка прапанавала Эўрасаюзу партнэрства ў рэалізацыі праекту «Белая плынь» («White Stream») па пастаўках газу ў Эўропу праз тэрыторыю Ўкраіны. На думку кіраўнічкі ўкраінскага ўраду, гэта дае магчымасьць дывэрсыфікацыі паставак газу ў краіны ЭС. Яна нагадала, што раней была створаная донарская група, што мусіць памагчы акумуляваць сродкі, неабходныя, каб мадэрнізаваць і рэфармаваць сыстэму паставак расейскага газу ў Эўропу праз тэрыторыю Ўкраіны. Ідэя стварэньня «White Stream» зьявілася ў 2005 г. Сутнасьць праекту — у пабудове газаправоду з Туркмэністану праз Азэрбайджан у грузінскі порт Супса, і затым па дне Чорнага мора праз Крым у кірунку Эўрасаюзу.

Пасьля сустрэчы зь Цімашэнкай камісар па пытаньнях замежнай палітыкі і эўрапейскай палітыкі добрасуседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр заявіла пра намер наведаць Кіеў 14 лютага ў рамках міжнароднай канфэрэнцыі на ўзроўні міністраў замежных справаў краінаў-чальцоў ЭС і краінаў Чарнаморскага рэгіёну.

29 студзеня ўкраінская інтэрнэт-газэта korrespondent.net са спасылкай на інфармацыйнае агенцтва Bloomberg працытавала словы Цімашэнкі аб падтрымцы Эўрасаюзам яе прапановаў пра перагляд дамовы з Расеяй пра пастаўкі газу ва Ўкраіну і Эўропу. «Я пачула падтрымку такога тыпу перамоваў тут сёньня. ЭС зацікаўлены ў фармаваньні доўгатэрміновай цэнавай палітыкі», — заявіла Ю. Цімашэнка па выніках візыту ў Эўрапарлямэнт. Паводле выданьня, Цімашэнка хоча таксама падвысіць тарыфы на транзыт расейскага газу і тарыфы на захоўваньне газу ва ўкраінскіх падземных газасховішчах і пазбавіцца ад газатрэйдэра RosUkrEnergo. Кіраўнічка ўраду заявіла, што будзе гаварыць пра гэта ў часе свайго хуткага візыту ў Маскву. Яна падкрэсьліла, што «павінна быць рынычная, а не палітычная дыскусія».

Ініцыятывы прэм'ер-міністра Ўкраіны пярэчаць ранейшым заявам прэзыдэнта краіны Віктара Юшчанкі наконт таго, што павышэньне тарыфаў на транспарціроўку расейскага газу праз тэрыторыю Ўкраіны можа зашкодзіць.

Апанэнты Цімашэнкі скептычна выказваюцца пра ажыцьцяўленьне праекту «Белая плынь». Так, былы міністар паліва і энэргетыкі Юры Бойка, дэпутат Вярхоўнай Рады ад Партыі рэгіёнаў, лічыць, што на гэты момант палітычная вага ЭС ужо скіраваная на падтрымку канкуруючага праекту «Nabucco».

«Nabucco» запраектаваны, як магістральны газаправод працягласьцю 3,3 тыс. км у абыход Расеі з Цэнтральнай Азіі ў краіны ЭС, найперш у Аўстрыю і Нямеччыну. Заплянаваная магутнасьць — 26—32 млрд кубамэтраў газу ў год. Пабудову плянуецца скончыць да 2012 году.

**Сямён Печанко; korrespondent.net, ukranews.com**

# На ўдзельніка акцыі прадпрымальнікаў заведзеная крымінальная справа



Андрэй Кім.

На Андрэя Кіма, затрыманага 21 студзеня пасьля мітынгу прадпрымальнікаў, заведзеная крымінальная справа паводле арт. 364 КК («Гвалт альбо пагроза гвалту ў адносінах да работніка міліцыі»). Пра гэта паведаміла «НН» маці хлопца Тацяна Кім. Андрэю пагражае ад трох месяцаў да шасьці гадоў зьняволеньня. Хлопец пакуль знаходзіцца на Акрэсьціна, дзе адбывае адміністрацыйны арышт. 22 студзеня ён быў пакараны паводле двух пратаколаў судом Цэнтральнага раёну Менску (судзьдзя — Тацяна Паўлючык) 10 суткамі арышту, а таксама 1 млн 50 рублямі штрафу.

Маці Андрэя кажа, што пасьля затрыманьня яго завезьлі ў РУУС Цэнтральнага раёну, дзе завялі дзьве адміністрацыйныя справы і адну крымінальную. Пазьней крымінальная была перададзеная ў раённую пракуратуру. Сьледчы Лугін сказаў, што ёсьць відэаматэрыялы. Нібыта Андрэй Кім падчас сутычкі каля ГУМу ўдарыў супрацоўніка ДАІ кулаком у твар і расьсёк таму брыво. Андрэй віну адмаўляе.

У пракуратуры ад камэнтароў адмовіліся, нават не пацьвердзіўшы, ці заведзеная такая крымінальная справа.

Цяпер родныя і сябры Андрэя шукаюць відэаматэрыялы таго інцыдэнту каля ГУМу, каб прадставіць у пракуратуру ў якасьці доказу невінаватасьці хлопца.

**Яраслаў Сьцешык**

# Дэвід Крэймэр пра вызваленьне Дашкевіча: «Думаю, што гэта пачатак працэсу»

Злучаныя Штаты вітаюць вызваленьне Зьмітра Дашкевіча і Віктара Аўтуховіча. Пра гэта амэрыканскі дыплямат заявіў на сустрэчы з групай беларускіх журналістаў у Вашынгтоне. «Думаю, што гэта пачатак працэсу. Каб адбыліся крокі насустрач, павінны быць вызваленыя ўсе астатнія пяць палітвязьняў, у тым ліку Зьдзьвіжкоў. Мы спадзяемся, што адбудзецца касацыя ягонага прысуду», — сказаў ён.

Крэймэр адзначыў, што, на ягоную думку, ЗША «трапілі ў кропку» санкцыямі супраць «Белнафтахіму». «Магчыма, Беларусь ня можа дазволіць сабе падпасьці пад далейшыя санкцыі», — адзначыў ён. У той жа час ЗША будуць вымушаныя разгледзець наступныя меры, калі ўсе вязьні, якіх Вашынгтон разглядае як палітычных, ня будуць вызваленыя. Санкцыі супраць «Белнафтахіму» былі мерай, прынятай ЗША паралельна з рашэньнем ЭС адмяніць прэфэрэнцыі ў гандлі зь Беларусьсю, наступныя крокі будуць прымацца ў каардынацыі з краінамі Эўропы, падкрэсьліў Крэймэр.

**Барыс Тумар, Вашынгтон**

# «Абмянялі хулігана на Луіса Карвалана»

Сьледам за Мікалаем Аўтуховічам ды Зьмітром Дашкевічам Юры Лявонаў стаў трэцім палітвязьнем, выпушчаным на волю цягам апошніх дзён. Тэндэнцыя? Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Намесьнік памочніка дзяржсакратара ЗША Дэвід Крэмэр аптымістычна спадзяецца, што гэта — «пачатак працэсу». Маўляў, трэба толькі дадаць скаардынаванага ціску з боку Вашынгтону і Брусэлю.

Беларускія ж камэнтатары дружна цьвердзяць пра палітычны торг. Адных выпускаюць, іншых садзяць. Прыклады апошняга часу: масавыя арышты ўдзельнікаў прадпрымальніцкага бунту, а таксама тры гады ўзмоцненага рэжыму журналісту Зьдзьвіжкову.

Ну а нібыта гуманныя жэсты (зазвычай ня надта шырокія: скасоўваюць невялікую рэшту тэрміну) робяцца з разьлікам дасягнуць нейкіх кан’юнктурных выгадаў. Летась у траўні, памятаеце, на пару месяцаў раней адпусьцілі з «хіміі» Статкевіча ды Севярынца. Тады Менск яшчэ песьціў надзею пазьбегнуць страты прэфэрэнцыяў у гандлі з Эўрасаюзам. Па інэрцыі «адліга» доўжылася яшчэ трохі часу: згадайма, як маладафронтаўцам паводле крымінальнага артыкулу давалі толькі штрафы.

Зараз жа, як нагадаў мне палітычны агляндальнік Паўлюк Быкоўскі, зноў надыходзіць час таргавацца з Эўропай — наконт умоваў экспарту тэкстылю, вяртаньня тых самых прэфэрэнцыяў і г. д.

Мікола Статкевіч, у сваю чаргу, мяркуе, што тут ёсьць момант псыхалягічнага ўзьдзеяньня на Расею. Масква, калі чарговы раз разварушваюць яе фобію («Беларусь сыходзіць на Захад»), можа трохі саступіць што да цэнаў на энэрганосьбіты.

Таксама, калі хочаце, горкая прыкмета беларускай «стабільнасьці»: колькасьць палітвязьняў у нас застаецца прыкладна на адным узроўні. Столькі, каб ня надта пераймаліся «чужыя» (Захад) і каб у той жа час баяліся «свае» (усе адкрытыя ды прыхаваныя праціўнікі ўлады).

Даючы сымбалічнае паслабленьне некаму з «палітычных», Менск атрымлівае падставу зноў цьвердзіць пра жэст добрай волі, на які мусіць адгукнуцца Эўропа. У эўрапейскай жа палітыцы і пасьля сыходу з пасады старшыні ПАРЭ ван дэр Ліндэна, які стаў прыкладам згодніцтва, нязьменна знаходзяцца ахвочыя да такіх гульняў дзеячы, якім карціць знайсьці чароўны ключык да брамы «апошняй дыктатуры».

Па сутнасьці, мы назіраем такі самы палітычны гандаль «жывым таварам», што практыкаваўся і ў савецкія часы. Старэйшыя памятаюць фрывольна-крамольную прыпеўку: «Абмянялі хулігана на Луіса Карвалана...» (табуяваны працяг пры жаданьні знойдзеце самі ў Сеціве:). Для маладзейшых: «хуліган» — дысыдэнт Букоўскі, Карвалан — лідэр чылійскіх камуністаў, пасаджаны Піначэтам.

Хіба што матывы цяпер не ідэалягічныя, а цалкам прагматычныя: каб «праклятыя буржуіны» шырэй расчынілі рынак, далі крэдытаў, інвэстыцыяў і ўсяго паболей.

Між тым, самым праблематычным выглядае вызваленьне Казуліна і Клімава. Абодва зарэкамэндавалі сябе палітычнымі рызыкантамі, гатовыміісьці на эпатаж ды экстрым. Звыш таго, абодва — скажам так — глыбока закранулі асабістыя пачуцьці афіцыйнага кіраўніка.

Зрэшты, шэраг палітычных агляндальнікаў (Юры Чавусаў, ужо згаданы Паўлюк Быкоўскі) лічаць, што калі добра прыцісьне, кіроўная вярхоўка можа вызваліць і самых праблемных для ее «палітычных». Пакуль, аднак, сытуацыя для ўлады не крытычная.

# Зьміцер Дашкевіч: «Генэралы КДБ хацелі, каб я застаўся ў Амэрыцы»

Гутарка са Зьмітром Дашкевічам адбывалася празь некалькі гадзін пасьля ягонага вызваленьня. Мы глыбокай ноччу вярталіся на адной машыне ў Менск з Воршы. Здавалася, што размова не пачнецца ніколі, бо тэлефон былога палітвязьня проста не сьціхаў. Нарэшце, на маё шчасьце, у мабільніку села батарэя і я спакойна змог ўключыць дыктафон.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**На Ўправе БНФ Зьмітра сустракалі кветкамі і сьлёзамі.**

**«Наша Ніва»: Зьміцер, дык што адбылося?**

**Зьміцер Дашкевіч:** Вечарам у сераду мяне выклікалі з працы. Думаў, што будзе чарговы допыт ці паставяць надгляд. Проста літаральна за два дні да гэтага прыяжджалі «чэкісты», празь некаторых асуджаных раілі мне, каб цішэй сябе паводзіў і г. д. У штабе ж ужо заявілі, што вызваляюць. Я спачатку нават падумаў, што яны прыколваюцца трошачку. Пачаў зьбіраць рэчы нават ня ведаючы, на якой падставе мяне вызваляюць, што за рашэньне прынятае. Толькі ў пяць гадзінаў вечару, ужо пасьляператрусу, мне далі прагледзець дакумэнты паводле якіх я, рашэньнем Вярхоўнага суду за 22 студзеня, вызваляюся. Фармулёўка была наступнай: паўтары гады зьняволеньня мне замяняюць на год.

**«НН»: А што тады рабіць з чатырма месяцамі, якія ты пераседзеў?**

**ЗД:** Калі я запытаўся, то пачалі пацiскаць плячыма. Казалі, што мы нічога ня ведаем. Цяпер буду прасіць у Вярхоўнага суду копію пастановы аб вызваленьні. Можа, папрашу, каб гэтыя чатыры месяцы ўлічылі мне на наступныя суткі арыштаў. Аж восем разоў змагу беспакарана хадзіць на акцыі пратэсту! (Сьмяецца).

**«НН»: У верасьні 2006 году ты быў гатовы да арышту?**

**ЗД:** Безумоўна. Маральна я рыхтаваў сябе да арышту ад Плошчы. Памятаеце, як заяўляў Сухарэнка, што кожны, хто выйдзе на Плошчу, будзе абвінавачаны ў тэрарызьме, і судзіць іх будзем ад 8 да 25 гадоў. Асаблівым зьдзіўленьнем арышт для мяне ня быў. Пэўнай нечаканасьцю — так.

**«НН»: Перад арыштам каля месяца прабыў у Штатах. Улады адмыслова падштурхоўвалі цябе да эміграцыі?**

**ЗД:** Абсалютна ўпэўнены, што падштурхоўвалі. Ні я, ні іншыя маладафронтаўцы, якія ішлі па гэтай справе не былі нават пад падпіскай аб нявыезьдзе. Я мяркую, што ўлады спадзяваліся на наш выезд з краіны. Потым гэта пацьвердзілася, калі ў СІЗА я чытаў матэрыялы крымінальнай справы. У адным з тамоў знайшоў дакладную аднаго з генэралаў КДБ Сухарэнку. Там адзначалася, што Дашкевіч сядзіць у Амэрыцы і вяртацца адтуль не зьбіраецца. Такі варыянт падзеяў іх вельмі ўзадаваў бы.

## Ахоўнікі пасьля прасілі прабачэньня

**«НН»: І якія адчуваньні былі, калі апынуўся за кратамі на не суткі, а па абвінавачваньні ў крымінальнай справе?**

**ЗД:** Шчыра скажу, адчуваньні былі такімі, што я працягваю сваю дзейнасьць. Як сказаў адзін зь сьледчых пракуратуры: «Дзіма, я разумею, што выступаю тут у ролі рэклямнага агента». І я перакананы, што гэтая крымінальная справа мне не нашкодзіла. Наадварот, за гэты тэрмін я набраўся нейкай мудрасьці, жыцьцёвага досьведу.

**«НН»: Першы суд за закрытымі дзьвярыма. Як яно было?**

**ЗД:** Ведаеце, да ўсіх гэтых рэчаў, якія некага шакавалі ці зьдзівілі, я ставіўся спакойна. Я быў перакананы ў справядлівасьці той справы, якую раблю. Адчуваў моцны супакой у сэрцы. Па-другое, я бачыў агромністую падтрымку маіх сяброў і паплечнікаў з «Маладога фронту». Таму гэты суд, як і іншыя цяжкасьці перанёс досыць спакойна. Я

ня думаў пра тэрмін, які мне могуць даць. Проста ведаў, што ўсё ва ўладзе Божай. Сьледчы мне казаў: «Дзімка, ня бойся, дадуць табе штраф». Сам я цудоўна разумеў, калі патрапіў у СІЗА, то штрафам ужо не абыдзецца. Калі пракурор на судзе запатрабаваў «два з двух», я асабліва не зьдзівіўся. Судзьдзі Але Булаш, якая ўрэшце дала мне паўтара году зьняволеньня, я шчыра сказаў: «Дзякуй за шэсьць месяцаў вольнага жыцьця».

**«НН»: Як сустрэла цябе шклоўская калёнія?**

**ЗД:** Марозам і заявамі адміністрацыі, што да мяне будзе такое самае стаўленьне, як да іншых вязьняў. Хаця трэба аддаць належнае некаторым ахоўнікам, якія прасілі ў мяне прабачэньня, што ад пачатку ў іх было няправільнае стаўленьне да мяне. Яны давалі мне самую цяжкую працу, пасьля якой я проста валіўся з ног і ня мог вечарамі нічога пісаць ці чытаць. Працаваў на пілараме, цягаў дошкі і бярвеньне. Зь цягам часу рэжым паслабілі.

**«НН»: У цябе было пяць папярэджаньняў. Такі злосны парушальнік?**

**ЗД:** Нельга адназначна сказаць, што атрымаў я іх толькі праз жаданьне адміністрацыі мяне пакараць. Былі там і мае памылкі, але зьвязаныя яны не з маім жаданьнем мяняць турэмны рэжым. Проста я — чалавек з волі — імкнуўся сябе паводзіць так, як іншыя зьняволеныя. Яны могуць спакойна хадзіць з атраду ў атрад, ім за гэта нічога не бывае. Калі ж я так раблю, то на мяне пішуць акт. З аднаго боку можна сказаць, што я паводзіў сябе, як іншыя і нічога не парушаў, з другога — літару закону я ўсё ж пераступаў. Таму тут быў такі двухбаковы рух. Папросту спачатку я не да канца разумеў тое месца, дзе апынуўся.

## Зона на яго ня моліцца

**«НН»: Што за людзі з табой сядзелі?**

**ЗД:** Розныя людзі. Агульна я мог бы сказаць, што мае стэрэатыпы аб зоне, як страшэнным месцы, дзе сядзіць мноства пачвараў, зьніклі. Цалкам нармальныя людзі, якія цудоўна разумеюць, што адбываецца ў нашай краіне. Калі я ехаў у калёнію, то ўзгадваў словы аднаго вядомага палітвязьня: «Зона моліцца на Лукашэнку». Хачу сказаць, што за шаснаццаць месяцаў сваіх вандровак не сустрэў ніводнага чалавека, які б гаварыў аб нашым гаранце Канстытуцыі нешта добрае.

**«НН»: Да цябе, як да палітычнага, ставіліся інакш?**

**ЗД:** Была нейкая ўвага. Таксама было разуменьне, што хлопец сядзіць за правільную справу. Больш за тое, у часткі было разуменьне, што сядзіць чалавек, зь імем якога ў краіне магчымыя зьмены (сьмяецца). І зьняволеныя, і міліцыянты разумелі, што тыя людзі, якія цяпер цярпяць за справядлівасьць, будуць у хуткім часе вырашаць лёс краіны.

**«НН»: Вышэй ты адзначыў, што да цябе прыходзілі «чэкісты». І часта гэта адбывалася?**

**ЗД:** Проста яны хацелі, каб усё было пад кантролем, каб на мяне часьцей даносілі. З кім я размаўляў, якія пляны на волі, што пісаў. Дапытвалі мяне па справах маладафронтаўцаў, але ў асноўным размаўлялі з тымі асуджанымі, якія былі побач са мной. Іх запалохвалі, палохалі ізалятарам.

**«НН»: Што дапамагала вытрымаць тэрмін?**

**ЗД:** Дапамагаў, безумоўна, Госпад, а таксама мае сябры. Мне пісалі мноства лістоў, на волі праходзілі кампаніі ў падтрымку, акцыі салідарнасьці. У СІЗА я атрымліваў інфармацыю досыць хутка, у калёніі з гэтым было ўжо цяжэй. Быў падпісаны на дэмакратычныя выданьні. Нейкі час мне ішла «Наша Ніва», пакуль яе не забаранілі мне аддаваць. Колькі ні гаварыў, што газэта афіцыйна зарэгістраваная, нічога не дапамагло. «Народная воля» прыходзіла да канца зьняволеньня.

## Усё ўжо зьмянілася 19 сакавіка 2006

**«НН»: Як з-за кратаў выглядалі падзеі, што адбываліся за гэты час у краіне?**

**ЗД:** Ціск на «Малады фронт» пакінуў вельмі моцнае ўражаньне. Аднак яшчэ большае ўражаньне на мяне зрабіла, як мужна гэтыя юнакі і дзяўчаты праходзяць выпрабаваньні. Ліставаліся з Артурам Фінькевічам. Мяне моцна закранула ягоная новая крымінальная справа і прысуд па ёй. Важным падаваўся моладзевы супрацоў, прадпрымальніцкія акцыі і кампаніі падтрымкі палітвязьняў. Нават на зоне адчувалася, што вось-вось нешта зьменіцца. Калі я прыехаў на зону, то ўсе пачалі ў мяне пытацца: «Дзіма, дык калі ўсё зьменіцца?» Мяне гэта моцна ўразіла, я зразумеў, што большасьць людзей ва ўсіх кутках Беларусі ўсё цудоўна разумеюць.

**«НН»: Дык, Дзіма, калі ўсё зьменіцца?**

**ЗД:** Я знайшоў адказ на гэтае пытаньне. Яно зьмянілася 19 сакавіка 2006 году. Цяпер гэтыя зьмены ідуць і паглыбляюцца ўсё больш.

**«НН»: Цяжка маральна было вытрымаць за кратамі другую крымінальную справу?**

**ЗД:** Можа, нехта і зьдзівіцца, але абсалютна лёгка. Нават ня ведаю, адкуль браліся сілы. Напэўна, з тых самых прычынаў пра якія я ўжо казаў, калі расказваў пра першы суд. Было разуменьне, што мяне хочуць зламаць, але цудоўна ўсьведамляў, што гэтым зламаць мяне немагчыма.

**«НН»: Што галоўнае вынес з турэмнага досьведу?**

**ЗД:** Што ўсё ў руках Бога. Турма толькі ўмацавала маю веру. Я магу адзначыць, што не шкадую ні аб адным дні, праведзеным у гэтым месцы. На зоне многія ісьціны прыходзяць усё ж значна хутчэй і адчуваньні становяцца нашмат глыбейшымі. Я нават удзячны Богу, што ён усё так сплянаваў і правёў мяне праз гэтую вялікую школу.

**«НН»: Чым цяпер зьбіраесься заняцца?**

**ЗД:** Буду займацца «Маладым фронтам». Разбудоўваць рэгіянальныя структуры, займацца рэгістрацыяй. Мы цяпер зарэгістраваныя ў Чэхіі, будзем гэта ж рабіць у іншых эўрапейскіх краінах. Хаця мы застаемся рэалістамі, таму разумеем, што ўлада пры жаданьні зможа знайсьці любы артыкул Крымінальнага кодэксу, паводле якога нас можна засудзіць. Гэта маленькае юрыдычнае прыкрыцьцё. Да вясновых акцыяў зьбіраемся падаваць заяўкі ў гарвыканкам, у Мін’юст на выдзяленьне нам памяшканьня для правядзеньня ўстаноўчага сходу. Я яшчэ ня вельмі добра дасьведчаны ва ўсіх нюансах, але адзначу, што «Малады фронт» будзе ўдзельнічаць ва ўсіх вулічных кампаніях, будзем шырока падтрымліваць «Рух «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча. Таксама, схіляюся да думкі, што будзем браць актыўны ўдзел у парлямэнцкіх выбарах.

**«НН»: Ты сам хоць ужо паверыў, што цябе вызвалілі?**

**ЗД:** Празь нейкі туман я ўсё бліжэй набліжаюся да гэтага ўсьведамленьня. Недзе трошку падаецца, што гэта сон. Дзівіць, што сёньня ня трэба быць на праверцы. Ужо дзесяць гадзінаў, а я магу ня спаць.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец, Ворша — Менск**

# Правадыры ўсіх краінаў

Ніколі ніводная дыктатура яшчэ не вырашала праблемаў, якія ляжалі перад краінай і нацыяй у момант прыходу да ўлады дыктатара. Піша **Віталь Тарас**.

## «Жывуць і перамагаюць...»

Апошнія гадоў дзесяць гэтую дату не пазначаюць у календарах і амаль ня згадваюць у газэтах. А быў час, калі ў гэты дзень усе газэты зьмяшчалі ягоныя партрэты, фатаграфіі, яму прысьвячаліся нарысы. У школах праводзіліся ўрачыстыя лінейкі з гэтай нагоды, у інстытутах і ва ўстановах — сходы.

Але ж і гэта — нішто ў параўнаньні са студзенем 1924 году.

Вось толькі два фрагмэнты з успамінаў сучасьнікаў.

«23 студзеня. Павялецкі вакзал. Расьцягнутая на шмат кілямэтраў жалобная працэсія за труной Уладзімера Ільліча павольна рушыць да Калённай залі. Доўгая чарга людзей у жалобе працягнулася ад Цьвярской да Дзьмітраўкі, хаця труну ў Дом Саюзаў яшчэ ня ўнесьлі і нікога пакуль не пускаюць. Людзі стаяць, пераступаючы з нагі на нагу, няглядзячы на дзікую сьцюжу. Як быццам сама прырода вырашыла наладзіць выпрабаваньне на трываласьць масквічам, піцерцам, шматлікім прадстаўнікам іншых гарадоў, якія прыехалі аддаць апошні абавязак Ільлічу. Потым пачалі паліць вогнішчы, каб сагрэцца. Бясконцая плынь людзей. І так амаль чацьвера сутак запар».

«Дык, значыць, праўда? Праўда, што няма больш ЛЕНІНА? Мы ніколі ня ўбачым ягоны мілы з прыжмурам твар? І камень, цяжкі камень лёг на сэрца, а да горла ўжо коціцца камок і цісьне, цісьне да таго моманту, пакуль з вачэй не пацякуць гарачыя-гарачыя раўчукі сьлёзаў.

А ўвечары на вуліцах крыкі газэтчыка: «Памёр Ленін!», «Сьмерць правадыра!», «Сканаў Ільліч!». Вакол суворыя пахмурныя твары... Безь пяці хвілінаў чатыры. Акурат 55 хвілінаў. Трамваі, рамізьнікі, пешаходы, усе… усё ўстала. Тысячы гудкоў загулі на ўсіх маскоўскіх фабрыках, заводах. Увесь пралетарыят, усе прыгнечаныя ўсяго сьвету разьвіталіся ў гэтую хвіліну са сваім правадыром і настаўнікам».

Самае дзіўнае ў тым, што раней, калі даводзілася чытаць падобныя апісаньні ў школьных падручніках, хрэстаматыях, у так званай «мастацкай літаратуры», гэта не выклікала ніякага зьдзіўленьня, успрымалася як натуральнае выказваньне народных пачуцьцяў. Праўда, у юнага чытача ў сямідзясятыя гады мінулага стагодзьдзя сьлёзаў гэтыя ўспаміны ўжо не выклікалі.

Але калі ўспомніць, што ўсяго за шэсьць гадоў да пахаваньня Леніна былі расстраляныя расейскі манарх разам з усёй сваёй сям’ёй і чуткі пра гэта не прывялі да яшчэ большых хваляваньняў у краіне, ахопленай грамадзянскай вайной… І што ўсяго чвэрць стагодзьдзя мінула пасьля Хадынкі, дзе людзі ціснулі адно аднаго на сьмерць, каб убачыць «гасудара»…

Уражвае, што такі малы адрэзак часу спатрэбіўся для таго, каб народ, які ўкленчваў перад царом, стварыў сабе новага куміра — абсалютнае боства, у параўнаньні зь якім усе астатнія цары, багі й бажкі падаваліся нічым.

Стагодзьдзе «правадыра камунізму» адзначалася яшчэ з усяе помпай, на якую толькі здольная была савецкая дзяржава. Праз дваццаць пяць гадоў імя Леніна ўжо мала каго цікавіла ў Расеі, а камуністы на прэзыдэнцкіх выбарах пацярпелі скрышальную паразу. Ды яны ўсё яшчэ кажуць — ідэі Леніна жывуць і перамагаюць…

## «Заміраньне свабоды»

Пахаваньне Сталіна было куды больш драматычным, чымся ягонага папярэдніка.

9 сакавіка 1953 году ягоны труп быў выстаўлены для разьвітаньня тамсама, дзе й цела Леніна ў студзені 1924-га — на пастамэнце ў Калённай залі Дому Саюзаў. Разьвітацца са Сталінам пажадалі два мільёны чалавек — масквічоў і гасьцей сталіцы. Той, хто прыйшоў на пахаваньне правадыра, ужо нікуды ня мог вырвацца. Ачапленьне МДБ на вуліцах не давала натоўпу разысьціся. У выніку тады загінула каля паўтары тысячы чалавек — большасьць зь іх былі проста размазаныя людзкой масай па сьценах вуліц і завулкаў. (Дакладная колькасьць загіблых падчас пахаваньня Сталіна дагэтуль не названая. Аднак лічба 1500 дзіўным чынам супадае з прыблізнай лічбай у 1300 загіблых падчас Хадынкі).

Гэта было ня столькі разьвітаньне Савецкага Саюзу са Сталінам, колькі прывітаньне Сталіна савецкаму народу з таго сьвету — так бы мовіць, на доўгую памяць.

Але зноў жа — колькі б ні пісалі цяпер кніг пра правадыра ўсіх народаў, колькі б ні здымалі фільмаў і сэрыялаў у славу Генэралісімуса, колькі б ні будавалі «лініяў Сталіна», ня кожны школьнік сёньня ўцямна адкажа, хто ён быў такі.

Гэта я не пра тое, што ўсё з гісторыі само некуды сплывае, зьнікае. Нічога ніколі бязь сьледу не зьнікае. Гэта закон фізыкі.

Ленін быў першым, але не апошнім вялікім дыктатарам ХХ-га стагодзьдзя. Пасьля яго былі Сталін, Гітлер, Мао Цзэдун. У Эўропе напярэдадні Другой усясьветнай вайны не было, бадай, ніводнай краіны, апрача Англіі й Швайцарыі, дзе на чале дзяржавы не стаялі б дыктатары — у тым ліку, у Латвіі, Літве, Эстоніі…

Апошняе дасьледаваньне арганізацыі Freedom House «Свабода ў сьвеце— 2007» паказала, што цягам апошніх трыццаці гадоў колькасьць свабодных краінаў у суадносінах з агульнай колькасьцю краінаў застаецца амаль нязьменнай. «Пік» свабоды прыйшоўся на 1997-ы. Сёньня спэцыялісты гэтай арганізацыі гавораць пра «заміраньне свабоды». А ў асобных рэгіёнах сьвету — найперш, у Азіі і Афрыцы — назіраецца палітычны рэгрэс.

Напрыклад, Тайлянд і Конга перайшлі з катэгорыі «часткова свабодных» у катэгорыю «несвабодных». (Беларусь тамсама й застаецца). Застаюцца слабымі дэмакратычнымі інстытуты ў ПАР, Кеніі, на Тайвані, Філіпінах, у Мэксыцы, Аргентыне, Бразыліі й… Вугоршчыне. Летась не было значных зьменаў да лепшага ў краінах СНД — у тым ліку, у Грузіі і ва Ўкраіне, якія лічацца «часткова свабоднымі». А ў



**Экспанаты прыватнага музэю «Эпоха Леніна», які летась адкрыў у сваім доме палачанін Мікалай Панкрат.**

Азэрбайджане і Кыргызстане (пасьля «туліпанавай рэвалюцыі») становішча пагоршылася.

У цалкам свабодных краінах сёньня жывуць 46 % насельніцтва плянэты. У цалкам несвабодных — 17 %.

## Дыктатура альбо сьмерць

Дзе гарантыя, што заўтра зноў ня зьявіцца «мода» на дыктатуру, і яна не ахопіць сёньняшнюю Эўропу, якая жыве бяз войнаў ужо 63 гады? Канечне, зьяўленьне дыктатараў пакуль болей характэрнае для краінаў «трэцяга сьвету». Але ж гарантыяў дэмакратыі, насамрэч, няма нідзе. Гэта досыць складаная сыстэма, якой нялёгка авалодаць. А нават і авалодаўшы — яшчэ цяжэй утрымаць. Як гэта можна бачыць на прыкладзе такіх дэмакратычных, здавалася б, краінаў, як Вугоршчына й Польшча.

Многіх працэсаў і тэндэнцыяў у разьвіцьці сучаснай цывілізацыі (калі ўвогуле можна гаварыць пра нейкую адзіную цывілізацыю — прынамсі, мумія ў маўзалеі ў цэнтры краіны наўрад ці зьяўляецца прыкметай цывілізацыі заходняй) мы ня ведаем ці яшчэ не разумеем.

Але відавочна іншае. Ніколі ніводная дыктатура яшчэ не вырашала праблемаў, якія ляжалі перад краінай і нацыяй у момант прыходу да ўлады дыктатара. У лепшым выпадку размову можна весьці пра невялічкае павелічэньне дабрабыту народу. Але яно заўсёды мізэрнае ў параўнаньні з дабрабытам дыктатара. Нават Ленін, пры ўсёй сваёй славутай сьціпласьці, жыў у шмат разоў лепей агромністай масы сялянаў і рабочых. Праблемаў з харчаваньнем ці вопраткай у яго не было. Пра «сьціпласьць» Сталіна, які трымаў у рабстве ўвесь Савецкі Саюз, наагул гаварыць сьмешна. Аднак — вернемся зноў на пяцьдзясят пяць гадоў назад — тыран памірае, і ўсяго праз тры гады ягоныя праграмныя пастуляты рэвізуюць, а яшчэ праз шэсьць — ягоны труп выкідаюць з маўзалею!

Не прайшло й году пасьля сьмерці Туркмэнбашы, а ягоны спадкаемца вяртае скасаваныя «бацькам усіх туркмэнаў» балет, опэру, цырк, дазваляе грамадзянам чытаць замежныя газэты…

Нядаўна кубінскі народ зноў абраў Фідэля Кастра дэпатутам нацыянальнага сходу. Вось ужо хутка год, як ён ня можа канчаткова прыйсьці ў сябе пасьля перанесенай апэрацыі на кішках. (Успамінаецца анэкдот пра Чарненку, які «на 74-м годзе жыцьця, не прыходзячы ў прытомнасьць, быў абраны старшынём Вярхоўнага Савету СССР»). Уся Куба чакае, ці застанецца Фідэль на чале дзяржавы, ці яго зьменіць ягоны брат Раўль. А тое, што народ, як і сорак восем гадоў таму, жыве паводле харчовых картак, без усялякай пэрспэктывы на лепшае — гэта няважна. Бо камандантэ, кажуць, гэта ж цэлая эпоха!

Эпоха чаго? Гэтае пытаньне лепей задаць аднаму зь ягоных нашчадкаў — Уга Чавэсу.

«Перамога альбо сьмерць!» — улюбёны лёзунг дыктатараў. Яны заўсёды карысталіся пладамі перамогі, а сьмерць прызначалася для іншых. Але аднойчы, рана ці позна, яна заўсёды прыходзіла і да іх. А потым наступала забыцьцё.

**23 студзеня**

### Зноў адлічылі

Моладзевую актывістку **Кацярыну Салаўёву** паўторна адлічылі з Полацкага дзяржунівэрсытэту. Дзяўчына навучалася на II курсе гістарычна-філялягічнага факультэту. Кацярыну не дапусьцілі да зімовай сэсіі, бо яна не здала залік па краіназнаўстве. У пачатку сьнежня 2007 г. Салаўёву ўжо адлічалі з унівэрсытэту. Аднак пад ціскам грамадзкасьці яе аднавілі ў ВНУ ўжо праз пару дзён пасьля выключэньня, але з адной умовай — да першага парушэньня ці затрыманьня. 14 студзеня Салаўёву асудзілі на 30 базавых велічынь штрафу — 1 млн. 50 тыс. рублёў — за нанясеньне палітычных графіці на Полацкі гарвыканкам.

Кацярына Салаўёва праходзіць як падазраваная ў крымінальнай справе паводле арт. 193 ч.1 «Удзел у незарэгістраванай арганізацыі». Другая крымінальная справа супраць Салаўёвай па «зьнявазе дзяржаўных сымбаляў» прыпыненая.

### КДБ цікавіцца

Актывістку «Моладзі БНФ» **Марыю Рудакоўскую**, навучэнку аднаго зь менскіх каледжаў, наведаў **капітан КДБ Бялоцкі**, які цікавіўся адукацыйнай вандроўкай Марыі ў Брусэль. Гутарка адбывалася ў кабінэце дырэктара каледжу. Са словаў дзяўчыны, капітан Бялоцкі пагражаў ёй праблемамі ў вучобе, калі тая ня спыніць палітычнай дзейнасьці.



Ігар Банцар.

### Затрымалі для лікбезу

Хлопцы і дзяўчаты раздавалі на плошчы Свабоды ў Віцебску недзяржаўныя газэты. Міліцыянты палічылі гэта праваларушэньнем і затрымалі сямнаццацігадовых **Крысьціну** і **Вікторыю Чыж**, іхную старэйшую сястру **Вераніку**, **Артура Шыкіна** і **Аляксандра Ільінца**, які ачольвае Кастрычніцкую раённую арганізацыю Партыі БНФ. Міліцыянты распыталі затрыманых пра газэты «Наша Ніва», «Новы час», «Навіны БНФ» і «Моладзь БНФ» і праз паўгадзіны ўсіх адпусьцілі, не складаючы пратаколаў.

### Банцара ў сьведкі

Супрацоўнікі міліцыі Ленінскага раёну Горадні прынесьлі пазоў галоўнаму рэдактару часопісу Magazyn Polski na uchodztwie **Ігару Банцару**. У позьве **маёр міліцыі Пётар Лянец** прапанаваў І.Банцару зьявіцца 28 студзеня ў Ленінскі РУУС у якасьці сьведкі. Аднак з пазову няясна, што за справа. Рэдактар не выключае магчымасьці арышту ў бліжэйшы час.

**28 студзеня**

### Затрымалі прадпрымальнікаў Цацуру і Насановіч

Прыкладна а 17-й на цэнтральнай плошчы Салігорску былі затрыманыя прадпрымальнікі **Аляксандар Цацура** і **Ларыса Насановіч**. Яны зьбіраліся подпісы салігорцаў у падтрымку дробных гандляроў, а таксама за адмену ўказу №760, які забараняе прадпрымальнікам мець найманых рабочых. На затрыманых склалі пратаколы, ноч яны правялі ў ізалятары часовага ўтрыманьня.

**29 студзеня**

### Прадпрымальнікі асуджаныя на 15 сутак

Судзьдзя салігорскага раённага суду **Аляксандар Бураўцоў** пакараў прадпрымальніцу **Ларысу Насановіч** і **Аляксандра Цацуру** 15 суткамі адміністрацыйнага арышту. Сьведкамі на судзе былі тры міліцыянты, а таксама два супрацоўнікі ўпраўленьня ідэалёгіі гарвыканкаму.

**СП**



Алесь Макаеў.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**27 студзеня**

### 15 сутак галадоўкі

З турмы на Акрэсьціна на волю выйшаў сябар каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў **Алесь Макаеў**. Усе 15 сутак арышту ён адмаўляўся ад ежы.




**27 студзеня моладзевыя актывісты Пружанаў (Берасьцейшчына) адзначылі сорак дзён з дня адмены льгот, зладзіўшы ім «помнік».**

NAVINY.BY

## За 2008 ліквідуюць шапікі з прыпынкаў

З лістапада 2000 ў Менску перасталі даваць дазвол на адкрыцьцё новых шапікаў на прыпынках транспарту. Колькасьць тых, што ёсьць, таксама скарачаецца, а за 2008 г. яны мусяць зьнікнуць зусім. Прыпынкі, з убудаванымі ў іх шапікамі (а ўсяго ў Менску такіх каля 280), пазамяняюць паветкамі. Застануцца толькі білетныя і газэтныя шапікі. Цяпер у Менску дзейнічаюць больш як 2,5 тыс. крамаў розных форм уласнасьці і больш як 1,5 тыс. сталовак. Таксама ў горадзе працуюць 34 гандлёвыя цэнтры і 22 рынкі.

## Міліцыя абавязвае прадпрыемствы абшываць вопратку флікерамі

Міністэрства ўнутраных справаў разаслала ўсім беларускім швачным прадпрыемствам ліст, у якім загадала нашываць сьвятлоадбівальныя стужкі на вопратку з усіх бакоў. Стужка павінная ісьці па рукаве, па нізе курткі, на сьпіне. У такім разе на пешаходзе будзе больш стужак, чым на інспэктару ДАІ. У Палажэньні МУС, накіраваным на беларускія швачныя прадпрыемствы, сказана: уся вопратка, што шыецца ў краіне, павінная быць сьвятлоадбівальнай. Калі абшыцьця яе згодна з правіламі, вопратка падаражэе дзесьці на 30 тысяч.

За мяжой шмат якая дзіцячая вопратка абшытая такімі стужкамі. Але найчасьцей гэта вопратка спартовая ці дызайнэрская.

## На Віцебшчыне паціснулі руку апошняму прыватнаму аўтазапраўшчыку

Апошняе на тэрыторыі Віцебшчыны прыватнае прадпрыемства па запраўцы аўтамабіляў палівам добраахвотна пазбылася ліцэнзіі. Ня вытрымаўшы бессэнсоўнай з гледзішча рынкавай эканомікі пакупкі па фіксаванай цане паліва ў прадаўца-манапаліста й продажу яго зноў жа па строга ўсталяванай цане, ААТ «Дарсэрвіс», дарэчы, разьмешчанае на людным месцы ля вёскі Пераваочная ля аўтатрасы Берасьце—Масква, аб'явіла пра здачу сваёй інфраструктуры ў арэнду ахвотным разбагацець на навары ў 20 тысяч рублёў з кожнай тоны прададзенага бэнзыну.

## «Аліварыя» атрымала амэрыканскі мэдаль

З «золатам» вярнуліся беларусы з Чыкага, дзе ўдзельнічалі ў Міжнародным піўным чэмпіянаце (World Beer Championship 2007). «Аліварыя Экстра» абышла многія ўсясьветна вядомыя маркі бурштынавага напою, якія былі прэзэнтаваныя ў сэкцыі «Сьветлы лягер». «Аліварыі» прысуджаны залаты мэдаль і званьне «Выключнае піва».



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Літва дбае пра міжнародны імідж

Ва ўрадзе Літвы ў пятніцу адбылася прэзэнтацыя маркетынгавай стратэгіі прасоўваньня новага міжнароднага іміджу краіны. Адным з прынцыпаў стратэгіі стане папулярызацыя ў сьвеце Літвы як «сьмелай краіны». Тэрмін «сьмеласьць», на думку распрацоўшчыкаў канцэпцыі, суправаджае Літву на працягу ўсёй яе гісторыі: ад старажытнасьці да таго часу, «калі Літва ініцыявала распад СССР».

Мяркуецца таксама зьмяніць англамоўную назву краіны: слова «Lithuania» цяжка вымавіць замежнікам.

## Модна стаць палякам

Сёлета колькасьць ахвотных запісацца на курсы польскай мовы ў Горадні вырасла ў некалькі разоў. Актывісты польскіх арганізацыяў зьвязваюць гэта з тым, што ўрад Польшчы прыняў г.зв. «карту паляка». Згодна з гэтым дакумэнтам, урад Польшчы дае прывілеі сваім суайчыньнікам, якія жывуць і ў Беларусі, для прыезду ў Польшчу. Адзін з пунктаў для атрыманьня «карты паляка», веданьне польскай мовы.

**ЗП**

**Паводле Эўрарадыё, БЕЛТА, «Вечерний Минск», BBC, Народныя навіны Віцебску, «Звязда»**



**Пэрспектыва Круглай плошчы (цяпер Плошча Перамогі) з боку цэнтру. Праект.**

# «Горад Сонца» не ўвасобіўся як цэльны горад

Было б добра дарабіць нешта з дэкору дамоў сярэдзіны 1950–х згодна з аўтарскімі задумамі, што ня зьдзейсьніліся ў свой час. Архітэктар **Ігар Байцоў** пра кнігу Артура Клінава.

Нядаўна зьявілася цікавая кніжка «Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца» Артура Клінава, прысьвечаная архітэктуры Менску, а ў «Нашай Ніве» адбылася дыскусія наконт гэтага выданьня (у №44 і №46 за мінулы год). Уся пасьляваенная адбудова Менску і пазьнейшае будаўніцтва адбывалася на маіх вачах, і тэма гэтая для мяне вельмі блізкая.

Выкарыстаньне такіх раскручаных брэндаў, як «Горад Сонца» і «Няміга», дапамагае шаноўнаму аўтару прыцягнуць увагу чытачоў да тэмы, што знаходзіцца па-за грамадзкай цікавасьцю, — да архітэктуры гораду. На жаль, цесныя рамкі гэтага прыёму прымусілі яго зьвярнуцца да значных спрашчэньняў і мастацкіх перабольшаньняў, якія перашкаджаюць заўважыць, разгледзець і асэнсаваць тое, што ёсьць у сапраўднасьці.

Насуперак сьцьвярджэньням аўтара «Малой падарожнай кніжкі» ў № 46 «НН», «Горад Сонца» не ўвасобіўся як цэльны горад, горадабудаўнічы ансамбль даўжынёю сем кілямэтраў ад плошчы Леніна да парку Чалюскінцаў. У рэальным Менску былі пабудаваныя толькі ўрыўкі ансамблевай забудовы і асобныя дамы ў стылі «савецкага ампіру», якія чаргуюцца з дамамі ранейшых і пазьнейшых часоў. Тое, што прапануецца лічыць «Горадам Сонца», на самай справе ня мае дакладных межаў і не зьяўляецца горадам у горадзе. Маштабы ансамблю былі такімі гіганцкімі, што немагчыма было пасьпець яго пабудаваць да чарговай карэннай зьмены густаў улады і ўсёй парадыгмы будаўніцтва.

Нават на галоўным праспэкце сталіцы за першае пасьляваеннае дзесяцігодзьдзе здолелі ў асноўным узьвесьці толькі часткі задуманага адзінага ансамблю — ад паштамта да цырка і ад Сьвіслачы да плошчы Якуба Коласа, хаця і без заплянаваных горадабудаўнічых акцэнтаў на маскоўскі капыл — высокіх дамоў са шпілямі на Цэнтральнай (цяпер Кастрычніцкая) плошчы і на рагу праспэкта і Даўгабродзкай (цяпер Казлова). Ад плошчы Якуба Коласа да парку Чалюскінцаў толькі галоўны корпус БНТУ з трыма інтэрнатамі можна лічыць архітэктурным ансамблем, а ўся астатняя забудова — проста два шэрагі

**Працяг на старонцы 19.**

# Дзякуй

**Вячаславу Д., Галіне Л., Яўгену Б., Сяргею К., Андрэю Е., Уладзімеру В., Мікалаю Я.** з Горадні.
**Любові П., Ігару Н., Максіму М.** з Гомелю.
**Вікторы К.** зь Пінскага раёну.
**А.К.** з Аршанскага раёну.
**Андрэю Н., А.А.** з Полацкага раёну.
**А.З.** са Смаргонскага раёну.
**І.Б.** са Шчучынскага раёну.
**К.** з Пастаўскага раёну.
**Алесю Р., Сяргею В.** з Наваполацку.
**Мікалаю С.** з Ганцавіцкага раёну.
**Іне П.** з Пухавіцкага раёну.
**Д.В.** зь Мядзельскага раёну.
**У.Т., Лілі Л.** з Маладэчна.
**Юр’ю Б.** з Кобрынскага раёну.
**А.Б.** з Ваўкавыску.
**Алене М., С.Р., Т.Ш.** зь Бярозаўскага раёну.
**Аляксандру П.** са Жлобінскага раёну.
**Сяргею Ц., Валеру П., Алесю Б., Лідзіі А., А.Ш.** з Баранавіцкага раёну.
**Сяргею У.** з Бабруйскага раёну.
**Сяргею Ц.** з Докшыцкага раёну.
**А.Б.** з Капыльскага раёну.
**Анатолю Б.** з Магілёва.
**Леаніду Г.** з Гарадоцкага раёну.
**Г.** са Смалявіцкага раёну.
**Мікалаю Б.** з Дубровенскага раёну.
**Андрэю Н., З.К., П.Б.** з Мастоўскага раёну.
**Ніне Б.** з Астравецкага раёну.
**І.Ш.** з Браслаўскага раёну.
**Уладзімеру І., Л.Ш., Яну Дз., Уладзіславу І.** зь Віцебску.

**Франц Сіўко. Дзень Бубна.** — Менск: Логвінаў, 2008. — 276 с.

# Новая кніга сэрыі

«Кнігарня «Наша Ніва»




ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перaказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

## «Слуханьні» па «Франдэсе» для галачкі

**17 студзеня ў Бярозе (Берасьцейская вобласьць) адбыліся грамадзкія «слуханьні» пра вытворчасьць пэстыцыдаў на замежным прадпрыемстве «Франдэса», якое было адчыненае побач зь Бярозаю летам мінулага году.**

Па праўдзе кажучы, «слуханьнямі» тое мерапрыемства, якое раённых ўлады разам з уласьнікам і адміністрацыяй прадпрыемства «Франдэса» вымушаныя былі правесьці пад ціскам пратэстаў немалой часткі жыхароў раёну, назваць даволі складана. Бо арганізатары «слуханьняў» не далі магчымасьці прысутным паслухаць аргумэнты апанэнтаў «Франдэсы».

Былы нампаліт вайсковай часткі сп. Уладзімер Касьянаў, якому даручылі весьці мерапрыемства пад назваю «слуханьні», умела, панампалітаўску, надаў «слуханьням» форму адказаў на пытаньні. У выніку тыя, хто прыйшоў на гэтае мерапрыемства, маглі толькі задаваць свае пытаньні наконт «Франдэсы», на якія адказвалі ўласьнік «Франдэсы» Барыс Фрыцаліс, іншыя прадстаўнікі адміністрацыі прадпрыемства, навукоўцы з Нацыянальнай акадэміі навук, якія з «Франдэсаю» супрацоўнічаюць, а таксама прадстаўнікі розных дзяржаўных установаў з раёну, вобласьці і сталіцы.

Спробы некаторых з прысутных (напрыклад, спн. Тамары Шчапёткінай, а таксама акадэміка Івана Нікітчанкі, які цяпер займаецца пытаньнямі экалёгіі і спэцыяльна прыехаў на слуханьні зь Менску) выказаць сваё асабістае меркаваньне наконт небясьпекі такой вытворчасьці каля Бярозы «дэмакратычна» абрываліся вядоўцам мерапрыемства. Ён прасіў «задаваць пытаньне».

Ён жа, а таксама сп. Генадзь Курыловіч, кіраўнік ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму, які падносіў мікрафон тым у залі, хто хацеў задаць пытаньне альбо даваў адказ, дазвалялі сабе даваць камэнтары адносна саміх пытаньняў і асобаў, што іх задавалі (маўляў, ну, колькі ўжо гэтая спн. Шчапёткіна будзе задаваць свае пытаньні).

Дарэчы, «слуханьні» былі арганізаваныя ў працоўны дзень а 14-й. Так што за вынікі галасаваньня і «карцінку» можна было асабліва не хвалявацца. Але вырашылі перастрахавацца і правесьці мерапрыемства амаль што ў найлепшых савецкіх традыцыях. Публіку ж падабралі адпаведную, якой дазволена было і працоўны час скарыстаць бяз страху быць пакаранымі за прагул.

Выбраную схему трохі зламаў сп. Юры Губарэвіч. Як на яго ні шыкалі з залі: хто ён такі, дзе ён цяпер жыве і кім працуе, — ён з падрыхтаваным на пяць хвілінаў выступам умудрыўся нават выйсьці да мікрафону на трыбуну. Аднак вядоўца ня даў яму магчымасьці дагаварыць. *Маўляў, тры хвіліны на выступ скончыліся. Просіш трыццаць сэкундаў, каб зачытаць вельмі важную інфармацыю, што тычыцца здароўя жыхароў Бярозы, давай яе ў прэзыдыюм — мы пачытаем.* Намесьнік старшыні Партыі БНФ ня стаў учыняць бойкі за мікрафон з чалавекам нашмат старэйшым за яго (міліцыянты, напэўна, ужо былі падрыхтаваныя) і мусіў сысьці са сцэны.

Тым ня менш, ініцыятары збору подпісаў супраць «Франдэсы» шмат чаго дамагліся. Прыцягнулі пільную ўвагу дзяржаўных установаў. Дамагліся прыпыненьня вытворчасьці на прадпрыемстве, пакуль ня будзе завершаная яго экалягічная экспэртыза. Т. Шчапёткіна агучыла ўсё ж свае заўвагі пра тое, што ў будучыні прадпрыемства пляную вытворчасьць больш шкодных рэчываў, чым цяперашні «Шквал». На што Б. Фрыцаліс толькі нэрвова адказваў: «Ну што Вы цяпер гаворыце пра 16-ты год. Мы што, зараз будзем абмяркоўваць 16-ты год?» (Маецца на ўвазе пуск трэцяга цэху (у 2012—2016 гг.), у якім будзе наладжаны выпуск некалькіх відаў актыўных рэчываў для вытворчасьці пэстыцыдаў). Падумалася, што ня вельмі ўпэўнена адчувае сябе сп. Фрыцаліс, пры тым, што ўжо на цяперашні час тры тысячы грамадзян Бярозаўскага раёну сказалі сваё катэгарычнае «не», падпісаўшыся супраць «Франдэсы». Тыя 148 «за», здабытыя па вядомых тэхналёгіях для галачкі, на якія спасылаецца цяпер грамадзянін сонечнага Ізраілю — камарыны піск.

Так званыя «слуханьні» скончыліся, але барацьба за выдаленьне «Франдэсы» зь Бярозаўскага раёну, які ў 2007 г. стаў рэкардсмэнам у Берасьцейскай вобласьці па выкідзе забруджвальных рэчываў ад стацыянарных крыніц, будзе працягвацца.

**Сяржук Русецкі, Тамара Шчапёткіна, Бяроза**

## Як мяне затрымалі

10 студзеня, падчас мітынгу прадпрымальнікаў, я быў затрыманы супрацоўнікамі АМАПу, апранутымі ў цывільнае. Я катаўся на каньках каля галоўнай Ялінкі краіны: спачатку я быў зь бел-чырвона-белым сьцягам, пасьля пакінуў сьцяг сябрам і працягнуў катацца безь яго. На мяне, падбягаючы, накінуліся два моцныя мужчыны. Я ўпаў, яны ўпалі на мяне. Дзьве мае сяброўкі спрабавалі мяне абараніць, але амапаўцы адкінулі іх, схапілі мяне за рукі за ногі і панесьлі за Палац Рэспублікі. Мяне паставілі на ногі (у каньках!), выгнулі рукі і павялі, лаючыся матам, у машыну. У машыне мне далі дазвол пераменіць абутак. Я чакаў на працягу 40 хвілін, увесь час за мнойназіралі. Я агледзеў сябе і ўбачыў, што мне парвалі куртку. Потым мяне перасадзілі ў іншую машыну і павезьлі ў Цэнтральны РУУС. Па дарозе яны зьдзекаваліся зь мяне (маральна), прыніжалі. У Цэнтральным РУУСе я сустрэў спадара Сіўчыка, якому прысудзілі суткі. Я быў адведзены да інспэктара па справах непаўналетніх. Амапаўцы склалі на мяне рапарт. Калі інспэктар пацікавіўся, чаму са мной не было сьцяга, за які мяне затрымалі, амапаўцы абгрунтавалі гэта тым, што ім быў дадзены загад затрымаць менавіта мяне. Пасьля гэтага яны сышлі. Шмат абставін у рапарце не было пазначана(напрыклад, пра канькі), ён увогуле амаль не адпавядаў рэчаіснасьці. Праз 15 хвілін прыйшла мая маці і забрала мяне дахаты.

**Станіслаў Стэсік, Менск**

## Пясьняр, які прабіў сьцяну

Год, які надышоў, — год юбілею У.Высоцкага. 25 студзеня яму споўнілася б 70 год — ён мог бы яшчэ жыць побач з намі. Але ён застаўся ў гісторыі СССР сымбалем гонару насельнікаў гэтай краіны і сымбалем змаганьня супраць яе неразумнага ўпарадкаваньня.

Пажыўшы некаторы час сваёго дзяцінства з бацькам-вайскоўцам за мяжой, Уладзімер пасьля вяртаньня ў Савецкі Саюз ня змог прыняць новых правілаў жыцьцёвай гульні. Дзяржава і творца ўступілі ў бойку, бойку жорсткую і няроўную, бо вельмі адрознымі былі іх вагавыя катэгорыі. І напачатку здавалася, што дзяржава перамагла: творца адышоў у іншы сьвет на 43-м годзе жыцьця.

Але менавіта з году пахаваньня У. Высоцкага лёс самой дзяржавы пакаціўся пад адхон. Яе эканоміка ня вытрымала агромністых стратаў на алімпійскія гульні, стратаў, якія не акупіліся, бо ЗША і шэраг іншых дзяржаў у знак пратэсту супраць разьвязваньня вайны ў Аўганістане адмовіліся ўдзельнічаць у гэтых алімпійскіх гульнях.

Сёньня Высоцкага ведаюць, Высоцкага слухаюць, кнігі Высоцкага выдаюцца вялікімі накладамі і разыходзяцца. Яго творы чытаюць, бо ў іх роздум пра тое, што трывожыць чалавека адвеку. Высоцкі — чалавек свабоды. У несвабодным грамадзтве ён змог захаваць сваю душу свабоднай. Яго творы найперш пра свабоду. Але й пра адказнасьць за яе. «Далі мне ўчора свабоду. Што я рабіць зь ёю буду?»

Ён ведаў, што рабіць з свабодай. Але ён не дажыў да часу, калі яе стала крышачку болей. Ён прабіў адну сцяну. Але ўспомнім В. Быкава: за той сьцяной другая… І яе прабіваць нам…

Высоцкі любіў жыцьцё. Трапіўшы ў пастку страшнай хваробы, ён адчайна чапляўся за жыцьцё, шукаў любыя сродкі, каб вылечыцца. Яны не дапамаглі. Нам засталіся яго песьні.

**Міхась Булавацкі, Магілёў**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# «Горад Сонца»
## не ўвасобіўся як цэльны горад

**Працяг са старонкі 16.**

дамоў вельмі align="" розная архітэктурнага ўзроўню і стылю ў выпадковым парадку, хаця дзе-нідзе прасочваецца схема былой маштабнай задумы.

Цяперашні праспэкт Незалежнасьці — гэта яркае адлюстраваньне барацьбы супярэчлівых густаў і сьветапоглядаў, барацьбы высокіх памкненьняў і прыземленага практыцызму, а не аднастайная прадукцыя нейкага ўсёмагутнага адміністратыўна-вытворчага мэханізму, што бездакорна дзейнічае.

Так здарылася, што прэстыжная забудова цэнтру пасьляваеннага Менску першыя год дзесяць вялася ў клясычным агульнаэўрапейскім стылі, які быў дэталёва распрацаваны, адточаны і выпрабаваны на працягу тысячагодзьдзяў. Гэта высокамастацкая архітэктурная мова. Яна дае магчымасьць стварэньня вытанчанай гармоніі і безьлічы складаных кампазыцыяў, а яе формы і дэталі прывабныя і для масавага густу. Праектаваньне вялося дойлідамі вышэйшай кваліфікацыі, у якіх быў неабходны для посьпеху мінімум творчай свабоды, хоць і ў жорстка абмежаваных рамках. Палітычная сымболіка ўжывалася вельмі стрымана і не парушала агульнага характару дэкору. Таму ўсё, што было пабудавана згодна з аўтарскімі задумамі, мае вялікую мастацкую вартасьць. Да таго ж, гэтая архітэктура не супярэчыць эстэтыцы былога Менску ні паводле матэрыялаў, ні паводле формаў. Нават зь менскім барока яна родная — гэта галінкі аднаго антычна-рэнэсансавага дрэва. Гэта высокаякасная аўтарская архітэктура, якую трэба пяшчотна захоўваць, якой можна ганарыцца. Зразумела, што масавае выкарыстаньне клясычнага стылю было анахранізмам і не магло цягнуцца доўга…

Шырока вядома, што ў сярэдзіне 1950-х з Масквы прыйшла пастанова, у якой «савецкі ампір» быў абвешчаны «архітэктурнымі празьмернасьцямі» і хутка саступіў месца архітэктуры максымальна спрошчаных формаў. Але і праз 50 год недарэчы згадваць, што ў выніку рэзкай зьмены дзяржаўнай палітыкі ў будаўніцтве ў Менску, як і паўсюдна, зьявіліся дамы са скалечанай архітэктурай. Перш за ўсё ахвярамі пастановы сталі ўжо запраектаваныя аб’екты і пачатыя будаўніцтвы. Перапалоханае партыйна-ўрадавай пастановай начальства патрабавала сьпешна выключыць з праектаў тое, што магло б нагадваць «празьмернасьць». У тых абставінах немагчыма было ўзьвесьці пабудову без парушэньня аўтарскіх задумаў, бяз значных стратаў архітэктурнай якасьці, немагчыма было папярэдзіць недасканаласьці аблічча. Можна ўявіць сабе, што перажылі тыя дойліды, калі іхныя творы на іхных вачах калечылі, а ім самім даводзілася ў гэтым удзельнічаць!

Два васьміпавярховыя сымэтрычныя жылыя дамы абапал праспэкта каля цырка не атрымалі задуманай парацнасьці і завершанасьці выгляду. На самых відных месцах добра бачныя дзіўныя абрэзкі архітэктурнага дэкору.

Васьміпавярховы жылы дом на плошчы Якуба Коласа падчас будоўлі быў скарочаны на адзін паверх і спрошчаны абліччам. Таму ён выглядае няўклюдным, прыціснутым цяжкім карнізам, а фасады аздабляюць пустыя круглыя ды паўкруглыя рамкі.

Яшчэ меней засталося ад аўтарскай задумы на фасадах будынка гатэля «Менск» насупраць паштамту — яны пазбаўленыя ня толькі вежкі над галоўным уваходам, але і большасьці архітэктурных дэталяў. Таму будынак выглядае безаблічным, абсалютна чужым і на праспэкце, і на плошчы Незалежнасьці. Груваткія навесы над уваходамі, што зьявіліся нядаўна, не палепшылі яго выгляду.

Гэта толькі тры з мноства прыкладаў шкодных наступстваў той пастановы, якімі ганарыцца не выпадае. Менску не хапае пераемнасьці. Ён разьвіваўся ня плаўна, а штуршкамі. Раз-пораз чарговы вецер пераменаў прыносіў звонку новыя вобразы сучаснасьці, якія прымаліся як абавязковыя да ўвасабленьня. Усё пабудаванае раней успрымалася састарэлым, ня вартым сапраўднай пашаны. Каб упэўніцца ў гэтым, вернемся на галоўны менскі праспэкт.

Нічыё вока не парадуе пабудова складанай формы побач з цыркам, што належыць спартоваму ведамству. Яна была перароблена ў часы барацьбы з «празьмернасьцямі» з дарэвалюцыйнай электрастанцыі. Гэта быў будынак цікавай, арыгінальнай архітэктуры. У выніку рэканструкцыі ён страціў усякую прывабнасьць.

Падобны лёс напаткаў і перадваенны трохпавярховы корпус радыёзаводу (цяпер праспэкт Незалежнасьці, 58). Ён вылучаўся вельмі добрай архітэктурай, але страціў эстэтычную і гістарычную каштоўнасьць пры рэканструкцыі з над-



**Праект маста праз раку Сьвіслач. Архітэктар М.Парусьнікаў.**



Пэрспэктыва забудовы праспэкту Сталіна (цяпер Незалежнасьці) ад Камароўскай плошчы да выхаду на Маскоўскую шашу. Праект 50-х.

будовай. Побач зь ім пакуль што ў аўтэнтычным выглядзе захоўваецца каштоўны фрагмэнт былой адзінай кампазыцыі — пераходная галерэя і агароджа з уязной брамай у архітэктурным стылі таго часу. Але на гэтым месцы зьбіраюцца будаваць «Гандлёвы дом» у выглядзе шкляной скрыні.

Унікальны даваенны будынак Прэзыдыюму Акадэміі навук пасьля вайны перажыў некалькі недарэчных сэансаў упрыгожваньня, якія парушылі яго гістарычнае аблічча. Цяпер на ім можна бачыць і ампірныя гірлянды і барэльефы са школьнымі глёбусамі з 1950-х, і гранітныя парталы брэжнеўскіх часоў. Да таго ж ён не падтрыманы забудовай і азеляненьнем, што яго атачаюць.

Знакаміты шэдэўр — Дом ураду — знадворна захаваўся ў добрым стане, але на непамерна вялікай плошчы такой формы, з такой забудовай, з такімі малымі формамі ён цалкам згубіўся і нагадвае састарэлага дзядулю, якога маладзейшыя не паважаюць, а толькі церпяць. Між тым, калі б плошчу і забудову ажыцьцявілі паводле задумы аўтара Дома ўраду І. Лангбарда, гэта быў бы ансамбль міжнароднай значнасьці.

Трэба ведаць, што нават найлепшая клясычная забудова праспэкта з часам страціла многа былой прыгажосьці. Зьнікла частка дэталяў, вытанчанае аўтарскае колернае рашэньне зьмянілася на меней удалае і значна грубейшае. Удзень эстэтыку фасадаў адчувальна пагаршае мноства сафітаў падсьветкі, а калі сьцямнее, фасады страчваюць разнастайнасьць і ператвараюцца ў чароды сьветлавых плямаў.

Бяру ўвагу на вады і недахопы таму, што яны ёсьць і ад іх трэба пазбаўляцца. Папраўляць можна толькі тое, што бачыш. Цяпер, калі Менск стаў сталіцай дзяржавы і расьце патрэба ў яго прэстыжным, яркім і пазнавальным абліччы, настае пара не абмяжоўвацца рэклямай таго, што ёсьць, а па-гаспадарску паклапаціцца пра аб'яднаньне ўсяго пабудаванага раней у адзінае архітэктурна-мастацкае цэлае, выправіць несутыкненьні розных пакінутых без заканчэньня пачынаньняў, зьліквідаваць відавочныя недарэчнасьці, запоўніць непатрэбныя прагалы. Вельмі важна адмовіцца ад практыкі пэрыядычнага «пераапрананьня» паводле апошняй моды архітэктурна паўнавартасных будынкаў былых часоў і вярнуць ім гістарычны выгляд — гэта ўзбагаціць аблічча гораду, дадасьць яму прывабнасьці. Было б добра нават дарабіць нешта з дэкору дамоў сярэдзіны 1950-х згодна з аўтарскімі задумамі, што ня зьдзейсьніліся ў свой час.

У фармаваньні ўнікальнага сталічнага вобразу Менску вялікую ролю могуць адыграць гарадзкія панарамы, што добра бачныя зь берагоў Сьвіслачы. Цяпер яны ў далёка не завершаным стане, а ў будучыні могуць набыць вялікую мастацкую якасьць, калі новыя пабудовы, што непазьбежна зьявяцца, будуць упісвацца ў створанае раней, гарманічна дапаўняць яго. Але можа здарыцца так, што пры абыякавасьці грамадзтва, пад моцным націскам прагматызму і вялікіх грошаў, панарамы будуць груба пашкоджаныя зьяўленьнем недарэчных набудаў, якіх ужо многа ў сьвеце. Наперадзе працяг усё той жа барацьбы творчых і прыземленых памкненьняў…



Праект забудовы раёну Круглай плошчы (цяпер Плошча Перамогі). Архітэктар М.Баршч.

# Калі ня будзе вайны, Клінтан мае шанцы

Сябар прэзыдыюму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, гісторык **Янка Запруднік**, які жыве ў ЗША, расказвае пра перадвыбарную гонку ў ЗША і ролю, якую ў ёй адыгрываюць беларусы Амэрыкі.

**«НН»: Існуе думка, што беларусы Амэрыкі больш падтрымліваюць рэспубліканцаў, бо тыя, маўляў, больш актыўна спрыяюць дэмакратычным рухам у сьвеце. Ці слушна гэта?**

**Янка Запруднік:** Агулам кажучы, так. Амэрыканцы беларускага паходжаньня заклапочаныя доляй свайго роднага краю. І ацэньваюць кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта ЗША паводле іхных выказваньняў адносна Беларусі й яе ўсходняе суседкі, ад якое заўсёды ішла пагроза свабодзе.

Традыцыйна ў галіне замежнай палітыкі Рэспубліканская партыя больш напорыстая, канфрантацыйная, чым партыя дэмакратаў. Згодна з такой лёгікай, беларусы аддавалі перавагу ў прэзыдэнцкіх выбарах кандыдатам Рэспубліканскай партыі.

**«НН»: Наколькі палітычна актыўныя амэрыканскія беларусы? Эмігранты старой хвалі і новае пакаленьне эмігрантаў — ці адрозьніваюцца яны паводле сваёй палітычнай актыўнасьці?**

**ЯЗ:** Палітычная актыўнасьць у Амэрыцы найбольш выяўляецца кожны чацьверты год у часе выбараў прэзыдэнта. Розныя ж іншыя выбары рэгіянальнага ці мясцовага кшталту, якія адбываюцца штогод, праходзяць цішэй, і там галасы падзяляюцца ў залежнасьці ад таго, якія праграмы прапануе кандыдат, якія сувязі мае з грамадой.

Эмігранты «старой хвалі» заўсёды бралі актыўны ўдзел у прэзыдэнцкіх выбарах, бо арганізаваныя ў сваіх суполках, маюць грамадзкія цэнтры, належаць да партыйных клюбаў. Да іх лягчэй дабрацца актывістам прэзыдэнцкіх кандыдатаў. Такія асяродкі існуюць і дасюль, хоць колькасьць іхных чальцоў значна паменшала апошнімі гадамі. Праўда, яны папоўніліся да некаторай ступені людзьмі з «новай хвалі», але далёка ня ўсімі. Рэч у тым, што савецкая, а цяпер лукашэнкаўская дэнацыяналізацыйна-русіфікатарская практыка пазбавіла людзей адчуваньня беларускай салідарнасьці.

**«НН»: Ці надаюць амэрыканскія палітыкі ўвагу беларусам-эмігрантам?**

**ЯЗ:** Амэрыканскія палітыкі ў выбарных кампаніях надаюць увагу ў першую чаргу тым выбарцам, якія могуць падтрымаць кандыдата грашыма або вялікай колькасьцю слухачоў. У такую катэгорыю беларуска-амэрыканскія асяродкі трапляюць рэдка, бо яны параўнальна малыя. У кандыдатаў графік напружаны, час на вагу золата. Адсюль прагматыка: да большай аўдыторыі большая ўвага. Гэта ня значыць, што меншыя групы або паасобныя грамадзяне ня маюць доступу да кандыдата. Амэрыканская палітычная культура забясьпечвае кожнай асобе ўвагу ад кандыдата або выбарнага чыноўніка. Практыка выбараў паказвае, што часамі перамогу вырашаюць некалькі дзясяткаў ці сотняў галасоў. З кожным выбарцам трэба лічыцца, асабліва ў выбарах ніжэйшага рангу.

**«НН»: За каго Вы асабіста зазвычай галасуеце — за дэмакратаў ці за рэспубліканцаў? Чаму?**

**ЯЗ:** Хоць я зарэгістраваны як дэмакрат, але ў прэзыдэнцкіх выбарах, а часамі і ў кангрэсавых, галасую за рэспубліканцаў. Калі заходзіш у выбарчую электронную кабіну, там ты сам з сабой і націскай якую хочаш кнопку. Ніхто твайго выбару ня будзе ведаць. А ў мясцовых выбарах (штатавых, муніцыпальных) галасую за дэмакратычны сьпіс, кіруючыся поглядам, што дэмакраты больш увагі аддаюць сацыяльным праблемам.

**«НН»: Каму зазвычай аддаюць свае галасы жыхары мястэчка Сомэрсэт, у якім Вы жывяцё? Каго найбольш падтрымліваюць у Нью-Джэрзі?**

**ЯЗ:** У Сомэрсэце, як і ў цэлым штаце Нью-Джэрзі, пераважаюць дэмакраты. Абодва прадстаўнікі штату ў Сэнаце ЗША — дэмакраты. Губэрнатар таксама дэмакрат. У прэзыдэнцкіх выбарах бальшыню галасоў ньюджэрзійцы таксама аддаюць за кандыдатаў Дэмакратычнай партыі. Тым ня менш, у паасобных акругах і гарадах некаторыя органы ўлады ачольваюць рэспубліканцы. Былі й губэрнатары-рэспубліканцы. Перамогу ў мясцовых выбарах вызначаюць найбольш асабістыя якасьці й здольнасьці кандыдата. Вялікую ролю адыгрывае таксама наяўнасьць у прэтэндэнта грошай, патрэбных на рэкляму свае кандыдатуры.

**«НН»: Каго з кандыдатаў Вы падтрымліваеце ў гэтай выбарнай гонцы?**

**ЯЗ:** Каго з кандыдатаў Вы падтрымліваеце ў гэтай выбарнай гонцы?

ЯЗ: У сёлетніх прэзыдэнцкіх выбарах я пакуль ня вызначыўся. Да выбараў, якія адбудуцца 4-га лістапада 2008 г., яшчэ далёка, шмат што ў міжчасе можа здарыцца. Але мая жонка Надзя ад самага пачатку ведае, за каго трэба галасаваць — за Клінтан.

**«НН»: Хто з кандыдатаў, на Вашую думку, мае найлепшыя шанцы зрабіцца прэзыдэнтам ЗША?**

**ЯЗ:** Калі міжнародная сытуацыя пад канец кастрычніка будзе ня надта напружанай для Амэрыкі, калі ня будзе немінучай пагрозы ваеннага канфлікту, скажам, з Іранам, дык вялікія шанцы будзе мець спадарыня Клінтан. Калі ж у выніку якога-небудзь тэракту ці ваеннае правакацыі ўзьнікне моцная трывога, выбарцы могуць аддаць перавагу кандыдату Рэспубліканскае партыі, асабліва, калі такім будзе Джон Маккейн, герой віетнамскай вайны й палітык зь лібэральнай дозай у сваім сьветаглядзе. Але прадказваньні — занятак рызыкоўны.

**«НН»: Як вы ставіцеся да палітыкі Джорджа Буша?**

**ЯЗ:** Ухваляю ягонае актыўнае падтрыманьне справы дэмакратызацыі Беларусі. Не ўхваляю за вайну ў Іраку й недаацэньваньне дыпляматычнага фактару ў замежнай палітыцы.

**«НН»: Што б Вы хацелі найперш зьмяніць у сучаснай амэрыканскай палітыцы?**

**ЯЗ:** Хацеў бы ўзмацніць падтрыманьне праграмаў, скіраваных на зьмяншэньне ў Амэрыцы і ў сьвеце экалягічнай пагрозы нашай плянэце.

**«НН»: Якія якасьці амэрыканскай палітычнай сыстэмы варта было б пераняць Беларусі, а якія — не?**

**ЯЗ:** Варта было б пераняць грамадзянскія свабоды, права на крытыку грамадзянамі ўрадавай палітыкі, свабоду самаарганізацыі, шырокія магчымасьці прадпрымальніцкай дзейнасьці, у тым ліку свабоду запусканьня ў вытворчасьць вынаходзтваў прыватнымі асобамі.

Ня варта пераймаць доўгіх перадвыбарчых кампаніяў, заканадаўчых дзірак у рэгуляваньні ролі капіталу ў выбарах, лішніх магчымасьцяў продажу й набываньня грамадзянамі агняпстрэльнай зброі, а таксама сыстэмы мэдычнага страхаваньня, якое далёка ня ўсе жыхары могуць сабе дазволіць.

**Запісаў**
**Алесь Кудрыцкі**



# Валёнкі

Фотарэпартаж **Андрэя Лянкевіча** з адзінай у Беларусі фабрыкі па вытворчасьці валёнак, што ў Сьмілавічах пад Менскам.











# Што згубіла Радэзію?

«На ўсе пытаньні адказ адзіны:/ У нас ёсьць «максім», / У іх няма «максіма». Піша Вацлаў Шаблінскі.

Прэзыдэнт Зымбабвэ Робэрт Мугабэ зноў у цэнтры ўвагі. Ягоны прыезд у Лісабон парушыў забарону Эўрасаюзу на знаходжаньне на яго тэрыторыі прадстаўнікоў гэтай краіны. Такая ж забарона, нагадаю, распаўсюджваецца на ўрадоўцаў Беларусі, а таксама М'янмы. Мугабэ прынята сёньня лаяць, называць чалавекам, які загубіў пасьпяховую краіну, з ухвалай успамінаць тыя часы, калі Зымбабвэ называлі «Радэзіяй» і там панавалі белыя. Памятаеце «расісцкую палітыку Сьміта»? Мугабэ — постаць адыёзная. І ўсё ж трэба прызнаць: калі б яго не было, у Радэзіі знайшоўся б іншы разбуральнік, які б зваўся Джошуа Нкома або Ндыбан Сытоле.

Дык чаму загінула Радэзія? І што гэта ўвогуле была за краіна?

Датай нараджэньня Радэзіі лічыцца 11 верасьня 1890 году. Узьнікала новая калёнія досыць тыпова. «Бацька Брытанскай імпэрыі», алмазны кароль Джордж Сэсыл Родз набыў у мясцовых правадыроў канцэсію на пошук золата. Калі ж тубыльцы ўбачылі, што чужынцы прыйшлі ўсур'ёз і надоўга, яны ўзялі ў рукі асэгаі, мясцовыя дроцікі, але былі разагнаныя агнём кулямёту «максім». Чарговую перамогу ангельскага льва апелі Кіплінг, Конан Дойл, Хагард: «*На ўсе пытаньні адказ адзіны:/ У нас ёсьць «максім», / У іх няма «максіма»*.

Новыя ўладаньні Яе Вялікасьці квітнелі. Там, дзе былі джунглі, прыйшлі чыгунка і тэлеграф, зьявіліся фэрмы. У сталіцы калёніі Солзбэры (цяпер Харарэ) засядалі мясцовы ўрад і парлямэнт, зразумела, толькі зь белых. Каляністы маглі быць задаволеныя дзейнасьцю сваіх абраньнікаў. Жыцьцё белага ішло ў Радэзіі паводле формулы «адзін плюс два плюс тры»: адзін дом, два басэйны, тры слугі.


**Алмазны кароль Джордж Сэсыл Родз, заснавальнік Радэзіі.**

Той жа, каго цікавілі ня толькі матэрыяльныя выгоды, мог сузіраць старажытныя пабудовы, якія тубыльцы называлі «дзымбабвэ» або «зымбабвэ». Вялікія вежы, старажытныя капальні, вытанчаныя скульптуры са сланоўай косткі наводзілі на думку пра вялікую цывілізацыю, прынесеную сюды насельнікамі Ўсходу ці нават іншых плянэт. Разглядаючы гэтыя дзівосы, белыя радэзійцы маглі і ганарыцца сваёй Радзімай, і разважаць пра натуральнае падпарадкаваньне ніжэйшых расаў вышэйшым.

Становішча зьмянілася, калі брытанскі археоляг Гертруда Кэтан Томпсан надрукавала свае дасьледаваньні адносна Зымбабвэ. Высновы аказаліся ашаламляльнымі. Старажытная культура мела мясцовае афрыканскае паходжаньне. Што гэта значыла для чорных, гаворыць сьведчаньне аднаго з будучых лідэраў чымурэнгі — вызваленчай вайны: «*Нас прымушалі вучыць падрабязнасьці з жыцьця старажытнага Эгіпту, але наша ўласная краіна быццам і не існавала, яна пачыналася з прыходу белых*». Адкрыцьцё Томпсан можна параўнаць па сіле яго ўзьдзеяньня зь пераасэнсаваньнем Міколам Ермаловічам значэньня Літвы ў беларускай гісторыі. Людзі раптам адчулі сябе аб'ектам, а не суб'ектам гісторыі, убачылі свае права на будучыню.

Яшчэ адной белай жанчынай, якая спрыяла пагібелі Радэзіі, была сёлетняя нобэлеўская ляўрэатка Дорыс Мэй Лесінг. У сваіх раньніх творах яна парушыла «зону маўчаньня» вакол Радэзіі і яе чорнага насельніцтва. Была паказаная беднасьць і прыніжанае становішча апошняга.

Лічылася, дарэчы, што чорныя ў Радэзіі жывуць больш заможна, чым іхныя браты ў Нігерыі або Ўгандзе. Аднак высьпявала думка, што тубыльцы маглі быць багацейшымі, калі б рэсурсы краіны належалі ім. Задушыць такія настроі меў на мэце «белы афрыканец у другім пакаленьні» прэм'ерміністар Радэзіі Ян Дуглас Сьміт. Паколькі Лёндан настойваў на неабходнасьці саступак чорным, Сьміт абвясьціў 11 кастрычніка 1965 году выхад Радэзіі з Брытанскай імпэрыі.

Рэжым Сьміта быў, відавочна, нелегітымным. Да ўлады ён прыйшоў, зьмясьціўшы свайго папярэдніка Філда. Таму нават ня ўсе белыя падтрымлівалі яго. Чорныя перайшлі да партызанскай вайны.



Сьміт пачаў зьбіраць наймітаў. Адзін зь іх пакінуў такое сьведчаньне пра пазыцыю насельніцтва: «*Ня ўсе яны (афрыканцы), вядома, падтрымліваюць партызанаў, але ўсе без выключэньня баяцца радэзійскіх жаўнераў*». Урэшце нават Прэторыя пачала ціснуць на Сьміта, каб ён знайшоў нейкі кампраміс з чорнымі лідэрамі.

Імя Мугабэ тады згадвалася рэдка. Найбольш папулярным лічыўся Абэль Музарэва — старшыня Афрыканскай Нацыянальнай Рады, біскуп афрыканскай мэтадысцкай царквы.

У савецкіх газэтах найчасьцей згадвалі Джошуа Нкома, кіраўніка ЗАПУ (Саюз Афрыканскага Народу Зымбабвэ), партыі народу ндэбэле.

Народ шона прадстаўляла групоўка ЗАНУ (Афрыканскі Нацыянальны Саюз Зымбабвэ). Ёй кіраваў Ндыбан Сытоле.

Музарэва і Сытоле падпісалі пагадненьне са Сьмітам пра падзел улады. Музарэва стаў прэм’ерам. Краіна пачала называцца Радэзія-Зымбабвэ. Хутка стала ясна, што ні Музарэва, ні Сытоле не карыстаюцца падтрымкай у краіне. Трэба было выбіраць паміж Нкома і Мугабэ, які зьмяніў Сытоле ў кіраўніцтве ЗАНУ. Нкома лічыўся прасавецкім, Мугабэ — пракітайскім, а значыць, антысавецкім. Таму Захад прызнаў ягоную перамогу на выбарах у красавіку 1980 году. На пачатку 1980-х Мугабэ меў досыць добрую рэпутацыю ў сьвеце. Ягоны галоўны вораг Сьміт знаходзіўся не ў вязьніцы, а ў парлямэнце краіны.


**Джойс Муджуру зьбіраецца балятавацца на пасаду прэзыдэнта Зымбабвэ.**

Вядомы літоўскі дысыдэнт Томас Вэнцлава, сын перакладчыка Купалы на літоўскую мову, пісаў, што «гэта ўсё роўна, калі б Пурышкевіч засядаў у Вярхоўным Савеце СССР і гаварыў, што хацеў». Мугабэ Вэнцлава, аднак, ужо тады па-прароцку параўнаў са Сталінам, а Зымбабвэ — зь «беларускай станцыяй пасьля вайны».

Канфлікт у Зымбабвэ нельга назваць расавым у чыстым выглядзе, бо некаторыя белыя фэрмэры карыстаюцца абаронай улады, а чорныя сяляне наадварот перасьледуюцца за «няправільнае галасаваньне». Нельга назваць і клясавым. Несумненна адно, сытуацыя ў краіне напружаная, магчыма, гэта нават грамадзянская вайна.

Галоўным супернікам Мугабэ лічыцца Морган Цвангірай — лідэр «Дэмакратычнага руху за зьмены». Цвангірай даўно абяцае скінуць «афрыканскага Лукашэнку», але пагроза можа чакаць Мугабэ і зь іншага боку. У друку зьяўляюцца зьвесткі пра магчымую змову ў атачэньні кіраўніка Зымбабвэ. Згадваецца, у прыватнасьці, імя віцэ-прэзыдэнта рэспублікі. Яна, дарэчы, наведвала Беларусь. Зь ёю Аляксандар Лукашэнка перадаў прывітаньне свайму зымбабвійскаму калегу. Джойс Муджуру — актыўная ўдзельніца партызанскай вайны. Чорныя называюць яе «афрыканскай Жаннай д’Арк». Спадарыня Джойс выступае з крытыкай эканамічнага становішча ў краіне. Яна заявіла пра свой намер балятавацца ў наступным годзе на пасаду прэзыдэнта. Усё гэта ня можа не хваляваць Мугабэ. У адрозьненьне ад Нэльсана Мандэлы ў ПАР ці Сэма Нуёмы ў Намібіі ён наўрад ці можа разьлічваць на пашану народу пасьля сыходу з прэзыдэнцкага палацу. Галоўнай крыніцай пагрозы для рэжыму застаецца галеча і бяспраўнасьць большасьці насельніцтва. Тое, што загубіла Радэзію.

## КАЛЯНДАР

# Люты

**2** — Грамніцы (у каталікоў).

**2** — 25 гадоў таму (1983) пры пажары трагічна загінуў Мікола Прашковіч, дысыдэнт, літаратуразнаўца, перакладчык. Пахаваны на могілках у в. Асмолаўка Бярэзінскага р-ну.

**4** — 200 гадоў таму (1808) нарадзіўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (фальварак Панюшкавічы, цяпер Бабруйскі р-н), паэт, драматург, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры.

**4** — Міжнародны дзень абароны ад раку.

**8** — 300 гадоў таму падчас Паўночнай вайны расейскае войска разрабавала і спустошыла Горадню.

**10** — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся Станіслаў Булак-Балаховіч (маёнтак Мейшты, цяпер Браслаўскі раён), вайсковапалітычны дзеяч, кіраўнік паўстаньня супраць савецкай улады. Загінуў у верасьні 1939 г. пры абароне Варшавы.

**13** — 125 гадоў таму (1883) памёр нямецкі кампазытар Рыхард Вагнэр.

**14** — Дзень Сьвятога Валянціна.

**15** — Грамніцы (у праваслаўных).

**16** — 250 гадоў таму (1758) нарадзіўся Юльян Нямцэвіч (в. Скокі, цяпер Берасьцейскі раён), пісьменьнік, палітык, гісторык, удзельнік паўстаньня 1794 г.

**17** — 75 гадоў таму (1933) адменены Сухі закон у ЗША.

**19** — 100 гадоў таму (1908) нарадзіўся Станіслаў Шушкевіч (в. Бакіна, цяпер Дзяржынскі р-н), пісьменьнік, вязень савецкіх канцлягераў, бацька першага кіраўніка незалежнай Беларусі.

**21** — Міжнародны дзень роднай мовы.

**23** — Дзень абаронцы Айчыны (у савецкай традыцыі).

# Незнаёмае праваслаўе

**Натальля Васілевіч**, яна ж Наталька Базылевіч, яна ж burbalka — прадстаўніца міжнароднай моладзевай праваслаўнай арганізацыі «Сіндэсмас» у Цэнтральнай Эўропе, рэдактар сайту «Царква» (http://churchby.inf), а ў Жывым дзёньніку ў яе 640 фрэндаў — то бок людзей, якія чытаюць яе допісы ў інтэрнэт-дзёньніку. З дапамогай інтэрнэт-тэхналёгій мы і пагутарылі.

**«НН»: Натальля, Вас характарызавалі мне як «моладзевую праваслаўную актывістку». Канечне, у гэтай фармулёўцы не адлюстроўваецца ўся Вашая асоба, але ж нейкая яе частка — несумненна. Таму напачатку хачу задаць Вам асабістае пытаньне. Вы верыце ў Бога літаральна? Ва ўваскрэшаньне Лазара? У Новы Ерусалім? У тое, што іконы крываточаць? У тое, што трэба цалаваць руку папу?**

**Натальля Васілевіч:** З вызначэньня «праваслаўная моладзевая актывістка» хіба што слова «моладзевая» не зусім адпаведнае. Хутчэй, я маладая, чым моладзевая — гэта вызначэньне майго ўзросту, а ня кшталту актыўнасьцяў. Але бяз слова моладзевая «праваслаўная актывістка» гучыць амаль што як «праваслаўная атэістка» — апошняе ж зусім не адпавядае рэчаіснасьці. Бо так, я веру ў Бога. Але ў Бога Слова нельга верыць літаральна, бо Слова большае за сукупнасьць літараў. Пытаньне пра веру для мяне не інтымнае — на тое я і актывістка. Так, і Біблія, Слова Божае, дзе апісанае ўваскрэшаньне Лазара, дзе даецца абяцаньне Новага Ерусаліму ў выглядзе прароцтва (а прароцтва заўсёды вобразнае, бо так і піша ў Адкрыцьці Ян Багаслоў: «І бачыў я»), — гэта не набор літараў, гэта рэальны досьвед верніка.

Кроваструменныя іконы бачыла ў Дзяржынску, аўтарытэтных царкоўных адназначных меркаваньняў наконт зьявы ў цэлым ці канкрэтных выпадкаў няма, а мой духоўны досьвед не дазваляе выносіць нейкія меркаваньні наконт гэтага фэномэну. Што тычыцца цалаваньня рук сьвятарам, то іх цалаваць ня трэба, але калі вельмі хочацца, то можна. І ўжо дакладна — да веры гэта мае самае аддаленае значэньне.



**«НН»: Чаму менавіта — праваслаўе? Гэта ў Вас ад сям'і, ад каранёў, ці гэта Ваш сьвядомы выбар? Раскажыце пра Вашыя карані, адкуль Вы, дзе і як атрымалі адукацыю, чым жывяце цяпер.**

**НВ:** Апошнім часам стараюся выкарыстоўваць сваё сапраўднае прозьвішча — Васілевіч, а не псэўданім Базылевіч. Мае карані — мае бацькі. Бацька Сьцяпан быў гэткім тыповым вусатым беларусам, толькі замест сахі і касы займаўся эканомікай і прадпрымальніцтвам. Маці Ніна — беларуска зь сям'і вясковых настаўнікаў, на адраджэнскай хвалі вылучалася ў Вярхоўны Савет XII скліканьня ад Менскага камвольнага камбінату і ішла па адной акрузе з Валянцінай Трыгубовіч. А потым мы з Валянцінай у адным асяродку сустрэліся — у Брацтве Віленскіх пакутнікаў, а гэта таксама мае карані.

Я не адразу стала праваслаўнай: па цэрквах у свой час шмат пахадзіла — то беларускасьці шукала, то Бога, то і таго, і другога. Але, урэшце, укаранілася ў Праваслаўнай Царкве. У праваслаўным вучэньні і традыцыі я адчуваю ісьціну, але пры гэтым паважаю ўсіх хрысьціян і адчуваю разьдзеленасьць хрысьціян як свой боль. Часам мяне «падазраюць» у пратэстантызьме — у нас краіна падазрэньняў — але з пратэстантызмам мяне яднае хіба ўласьцівы пратэстантам хрыстацэнтрызм веры.

Калісьці для мяне хрысьціянства было непрымальным — яно мне падавалася бессэнсоўным палонам і абмежаваньнем. І я не ўяўляла сябе там, што называецца трыма літарамі РПЦ ці дзьвюма МП. Безумоўна, я не адмаўляю, што Праваслаўнай Царкве ў Беларусі нестае беларускасьці, дый наагул, шмат праблемаў, але для мяне Царква і стала Радзімай. А Радзіма і дзяржава — гэта розныя рэчы. І калі ў нашай дзяржаве праблемы — гэта заклік да іх выпраўленьня, а не да эміграцыі.

У царкву я прыходзіла празь беларускія літургіі і малебны на беларускай мове ў Петра-Паўлаўскім саборы, праз брацтвы Канстанціна Астроскага і Трох Віленскіх пакутнікаў. Але найбольшы ўплыў на мяне зрабілі сустрэчы са сьвятымі людзьмі, а таксама тое, што я паўжартам называю Праваслаўем Чацьвертага Рыму, пра якое раскажу падрабязьней далей.

## Адзін супраць другога

**«НН»: Сайт, які Вы рэдагуеце, адрозьніваецца ня вельмі характэрнымі для звычнай нам праваслаўнай царквы экумэніч-**

**насьцю і цярпімасьцю да іншых канфэсій. Раскажыце пра тое, як ён задумваўся і як жыве.**

**НВ:** Сайт задумваўся мной і а. Аляксандрам Шрамком як альтэрнатыўны праваслаўны рэсурс, у працэсе разьвіцьця ён перажываў шэраг трансфармацыяў. Я б не сказала, што мы дужа экумэнічныя, бо ўрэшце сайт атрымаўся больш праваслаўным, чым проста хрысьціянскім. Мы не хаваем прыналежнасьці да Праваслаўнай Царквы, але стараемся быць непрадузятымі. Сайт трымаецца на сілах трох чалавек. Гэта даволі цяжка і займае часу, але мы робім працу з радасьцю, бо бачым, што яна патрэбная.

Што да стану цэркваў у Беларусі, дык галоўная праблема — гэта адсутнасьць таго, што называецца ў праваслаўнай традыцыі «саборнасьцю». Усе цэрквы пакутуюць на недахоп гэтай саборнасьці, як ва ўнутраным жыцьці, так і ў міжцаркоўных стасунках. Грамадзтва атамізаванае, людзі разьяднаныя, калі яны спрабуюць зьяднацца паводле ўласнай ініцыятывы — яны падпадаюць пад артыкул «стварэньне і кіраўніцтва незарэгістраванай арганізацыяй», у іншых жа выпадках іх яднаюць «зьверху» — праз БРСМы, праз разнарадку на ўдзел у «дзяржаўных» мерапрыемствах, праз «ідэалёгію». Безумоўна, рэжым часта не дасягае сваіх мэтаў, а грамадзянскія рухі часам сваіх мэтаў дасягаюць. Тое самае, на вялікі жаль, адбываецца з цэрквамі, асабліва з праваслаўнай і каталіцкай, — яны пачынаюць атаясамліваццa з клерам, а сьвецкія рухі, ініцыяваныя сьвецкімі вернікамі, апынаюцца ў сытуацыі NGO ў дзяржаве. Здавалася б, гэтая праблема ня тычыцца пратэстантаў, але і там не абыходзіцца без празьмернай «дысцыпліны». І менавіта гэта замінае міжхрысьціянскай салідарнасьці, да таго ж ніхто не жадае ісьці супраць сваіх інтарэсаў, нават калі справа заходзіць пра праўду. А сама праўда перастае быць значнай каштоўнасьцю, хрысьціяне робяць тое, што іх зусім не ўпрыгожвае — пагаджаюцца зь няпраўдай, пакуль яна ня тычыцца асабіста іх.

**«НН»: Рыхтуючыся да інтэрвію з Вамі, я прачытала ў інтэрнэце Ваш артыкул «Цэрквы Беларусі: адзін супраць другога». Ён уразіў мяне сьмеласьцю ў ацэнцы справаў як у палітычнай, так і ў рэлігійнай сфэры. Вы пішаце, што праваслаўе, працуючы на ўлады і пад кантролем уладаў, ператвараецца з рэлігіі жыцьця ў рэлігію пахаваньня, што яно, атрымліваючы ад уладаў прэфэрэнцыі, губляе аўтарытэт... «Страшнае ня тое, што ўлада забірае свабоду сумленьня і нават ня тое, што яна прымушае ісьці з гэтым самым сумленьнем на кампрамісы. Страшна, што часта цэрквы гуляюць на гэтым полі на баку ўлады», — робіце Вы выснову. Ясна, што падобныя высновы шмат каму не спадабаюцца. А навошта, па-простаму кажучы, Вам гэта трэба? Думаеце, што «дзевачка з кадзілам» зможа рэфармаваць царкву?**

**НВ:** Кожны артыкул заўжды мае пэўнага адрасата, часам прыходзіцца радыкалізаваць пытаньні, каб вывесьці «адрасата» са стану Кая ў краіне Сьнежнай Каралевы. Часам пішу ад болю, ад безвыходнасьці, ад роспачы, тады выходзіць крык, гэткая «жаночая публіцыстыка». Рэфармаваць царкву? Не, гэта не служэньне «дзевачак з кадзілам». Царкву можа рэфармаваць толькі сама Царква. У Праваслаўнай Царкве адной з асноўных формаў рэфармаваньня зьяўляюцца Саборы. Аднак Дух Сьвяты дзейнічае і праз асобных сьвятых людзей, і праз духоўныя рухі, і праз знадворныя акалічнасьці, і нават, можа, дзеяньні ворагаў і ганіцеляў Царквы пераўтварыць на карысьць Ёй. Сусьветны праваслаўны рух «Сіндэсмас», у межах якога працуе «дзевачка з кадзілам» і зь якім суаднасіць сваю дзейнасьць, ня ставіць на мэце даць гатовыя адказы на сёньняшнія праблемы, нашай галоўнай мэтай ёсьць — паглыбіцца ў хрысьціянскую веру і ў праваслаўнае Паданьне.

## Пра «Сіндэсмас»

**«НН»: Раскажыце, што гэта за арганізацыя — «Сіндэсмас»?**

**НВ:** Спачатку раскажу пра Чацьверты Рым. Чытачы «НН» скептычна ставяцца да фразы «Масква — Трэці Рым, а чацьвертаму ня быць». Расейскае праваслаўе дало шмат сьвятых, духоўных скарбаў, але дало і ўзор забабонаў, вычварэнскага супрацоўніцтва зь дзяржавай, цемрашальства. У другой палове XIX — пачатку XX ст. тагачасныя рэлігійныя інтэлектуалы асэнсавалі, наколькі далёка стаяла тагачасная царква ад эвангельскага ідэалу і праваслаўнай Традыцыі, і ў царкве пачаліся пошукі, якія падрыхтавалі дзейнасьць Памеснага Сабору 1917—1918 гг. Аднак ганеньні перапынілі працу Сабору, і, фактычна, спадкаемцамі царкоўнага адраджэньня сталі праваслаўныя ў эміграцыі. Новым цэнтрам, які даў у XX ст. цэлую пляяду багасловаў і сьвятых, а таксама паказаў новы кшталт царкоўнага жыцьця, стаў Парыж — багаслоўская школа і хрысьціянскі студэнцкі рух, якія былі там запачаткаваныя, зьвязаныя з імёнамі а. Іаана Меендорфа, а. Аляксандра Шмемана, а. Георгія Фляроўскага, мітр. Сураскага Антонія. У такіх умовах узьнік і «Сіндэсмас», устаноўчы сход якога адбыўся ў 1953 годзе. Засноўвалі яго багасловы і сьвятары новай хвалі — ня толькі «рускай» традыцыі, але і грэкі, праваслаўныя з Блізкага Ўсходу. «Сіндэсмас» быў зараджаны энэргіяй праваслаўных рухаў, многія з заснавальнікаў сталі вядомымі місіянэрамі, япіскапамі, прызнанымі багасловамі. «Сіндэсмас» выхоўваў. Яму ўдалося пераадолець тое, што называецца «нацыянальным» праваслаўем, а дакладней — праваслаўем нацыяналістычным і імпэрскім, якое ня мае дачыненьня да веры.

Звычайна ў нашых мерапрыемствах удзельнічаюць маладыя праваслаўныя беларусы, якія хочуць царкоўнага адраджэньня і гатовыя дзеля яго працаваць.Зь сярэдзіны 1990-х беларусы адыгрываюць у «Сіндэсмасе» не апошнюю ролю — як сваімі ўдзельнікамі зь Беларусі, так і з Польскага Брацтва Праваслаўнай Моладзі.

У цэнтры ўвагі «Сіндэсмасу» — адраджэньне праваслаўнай місіі, катэхізацыя і багаслоўская адукацыя, літургічнае абнаўленьне, у т.л. пераклады літургічных тэкстаў на сучасныя мовы, экумэнічны дыялёг, сьведчаньне пра ісьціну, пераадоленьне палітызацыі праваслаўя.

На заканчэньне хачу павіншаваць тых чытачоў «Нашай Нівы» (а сама я чытаю «НН» зь сярэдзіны 1990-х), якія сьвяткуюць паводле старога стылю, са сьвятам Тэафаніі, Богазьяўленьня — гэта Хрышчэньне Госпада і выхад Яго на служэньне.

**Гутарыла**
**Наталка Бабіна**

# Партрэт калектыўнага Пуціна

Расейскае кіно стала люстэркам расейскага капіталізму. Піша **Андрэй Расінскі.**

*«Я зазірнуў у вочы Пуціну і ўбачыў ягоную душу».*
***Джордж Буш-мал.***




На беларускіх экранах расейскае кіно займае другое месца пасьля амэрыканскага. Лазыцца прэм’еры, суседзкія фільмы старанна рэклямуюцца, пракат мае вялікую касу.

Штотыдзень гледачам прапануюцца дзьве—тры сьвежыя расейскія стужкі, зборы ад «Іроніі лёсу-2» перавысілі 40 млн. даляраў, а бюджэт сярэдняга расейскага фільму, найвыгаднейшы для прадусараў, складае, са словаў Андрэя Курэйчыка, $2—3 млн (трацiна гадавога прыбытку ўсяго беларускага пракату).

«9 рота» і «Код Апакаліпсісу», «Самы лепшы фільм» і «Сволачы», «12» і «1612», «Стацкі дарадца», «Турэцкі гамбіт», «Начны дазор», «Ваўкадаў», «Антыкілер»…

Пасьля крызісу 1990-х расейскае кіно імпэтна засвоіла рынак і агрэсіўна пераймае галівудзкія вынаходкі.

Чым камэрцыйны расейскі фільм розьніцца ад адпаведнага амэрыканскага? Здаецца, усё тое ж: бюджэт, рэкляма, эфэкты, жанр, але не пакідае пачуцьцё, што нешта ня так.

Масавае кіно заўжды тавар.

Спраўна працуюць расейскія кінашколы, выходзяць кіначасопісы, тэлеканалы патрабуюць усё болей і болей «мыла».

Нельга гаварыць і пра адсутнасьць традыцый. У 1920-я Расея стала вялікай кінадзяржавай. З таго часу яна заўжды была адметная аўтарскім кіно, але й жанравае кіно не было забытае (фільмы Гайдая, Матыля й Мяншова). А фільмы Аляксандрава («Цырк», «Волга-Волга», «Вясна») — сталінскія казкі, якія й сёньня глядзяцца зь цікавасьцю.

Расейскае кіно заставалася жывым да канца 90-х, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы. Потым адбыўся надлом.

Першай ластаўкай «пуцінскага кіно» была карціна Мікалая Лебедзева «Зорка» (2002).

Рэжысэр зьвярнуўся да забытай аповесьці Э. Казакевіча, ужо стаўленай у сталінскія 50-я. Расейская публіка прыхільна прыняла гераічны эпас з хічкокаўскімі прыёмамі, а на Захадзе гледачы біліся ў гістэрыцы: «Хто даслаў сюды гэтую савецкую архаіку?» Вайсковы патас выклікаў рогат, але савецкія людзі пускалі сьлязу.

Казкі сталінскіх часоў вярнуліся з «Ваўкадавам». Стужка таксама пастаўленая Мікалаем Лебедзевым. Спэцэфэкты, народныя касьцюмы, магія і вайна. У 1952 г. былінны «Садко» выклікаў захапленьне ў Вэнэцыі, малады Фрэнсіс Форд Копала вучыўся на ім перамантажу. «Ваўкадаў» цікавы толькі расейскай аўдыторыі, што зачытваецца фэнтэзі — і прагне рэваншу.

Пуцінскае кіно — «патрыятычнае».

Амэрыканскае кіно таксама патрыятычнае. Галівудзкія фільмы — бязьлітасны гімн амэрыканскаму ладу жыцьця. Абавязкова ёсьць сям’я й яе каштоўнасьці, абавязкова маецца на ўвазе Бог (справядлівы судзьдзя), абавязкова прамільгне ў кадры амэрыканскі сьцяг.

Але галівудзкае кіно ідзе нарасхват. Яго глядзяць у Швэцыі, камуністычным Кітаі й тэакратычным Іране. Нават «Дзень Незалежнасьці» Роланда Эмэрыха, дзе амэрыканскі прэзыдэнт узначальвае сілы Зямлі супраць іншаплянэтнікаў, — не выклікае нуды.

А вось на пуцінскі «07 мяняе курс» не загоняць нават расейскіх школьнікаў.

У галівудзкім кіно ёсьць унівэрсальны чалавек, які дзейнічае. Можна атаясаміцца з былым паліцэйскім, які шукае скрадзеную дачку, паспачуваць хатняй гаспадыні, якая згубіла мужа. «Патрыятычныя знакі» ня ёсьць зьместам амэрыканскіх карцін, яны зьяўляюцца самі сабой — як звыклы лад жыцьця.

У цэнтры ж пуцінскага кіно — натужлівы «патрыятычны знак». Героі спачуваюць «дзяржаўнасьці», хвалююцца за «імпэрскую ідэю», пераймаюцца «саборнасьцю». Не чалавек, а мундзір, не герой, а пасада, ня воля, а інструкцыя.

«Стацкага дарадцу» параўновалі з зомбі-фільмам. Так яно й ёсьць. Фандорын у выкананьні Меншыкава і пад апекай Міхалкова — як труп на дзяржаўнай службе.

Нават адмысловыя эфэкты ў «Дазорах» — не забава, а сур’ёзная ідэалягічная задача: паказаць, якая Расея «крутая» і што яна таксама можа. А «Іронія лёсу-2» — зацягнуты рэклямны ролік шчасьлівага жыцьця пад піцерскім кіраўніцтвам. Як расейскі капіталізм быў зацугляны ГБ, так і камэрцыйнае кіно стала партрэтам калектыўнага Пуціна.

Ні рэжысэры, ні іх пэрсанажы ня вераць у тое, пра што гавораць — і што пакліканыя абараняць зь пенаю ля роту. Фандорыны з патухлымі вачыма, яны падпарадкоўваюцца, але ня ведаюць, дзеля чаго. Шараговыя агенты дзяржавы, якой няма, Штырліцы бязь яйцаў.

У гэтым іх прынцыповае адрозьненьне і ад амэрыканцаў-індывідуалістаў, і азіятаў-калектывістаў — якія зьбіраюць каманды кун-фу, каб паказаць, што «іх школа найлепшая».

У «баявых манахаў Шаалiню» і «Сямі самураяў» свой статут гонару і аўтаномія — якой ня можа быць у пуцінскіх чыноўных макетаў.

Справядліва зазначыць, што на фоне бадзёрых расейскіх карцінаў беларускія выглядаюць яшчэ горш. Нэасталінскую «Радзіму альбо сьмерць» саромеюцца паказваць у кінатэатрах, чаргінцоўскае «Вам заданьне» зрабіла бы фурор на любым трэш-фэсьце.

Мы былі першымі ў вяртаньні занудлівага сталінскага канону, дай Бог станемся першымі і ў вызваленьні ад яго.

Але Расею шкада.

## Капітан Танака хоча патэлефанаваць зайчыку. Дапамажы яму адшукаць слухаўку ад свайго тэлефона!




http://www.tanakaland.org

## ВЫСТАВЫ

### 200 гадоў Дуніну-Марцінкевічу

Да юбілею прымеркаваныя наступныя падзеі:

**У нядзелю, 3 лютага, а 11-й мітрапаліт** Тадэвуш Кандрусевіч асьвеціць **у бабруйскім парафіяльным касьцёле** мэмарыяльную шыльду ў гонар 200–годзьдзя хросту пісьменьніка Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча.

**4 лютага а 12-й** — імша за Дуніна–Марцінкевіча **ў касьцёле Сьв. Роха**, дзе былі ахрышчаныя ўсе дзеці В. Дуніна–Марцінкевіча).

**13.00 —** Канцэрт арганнай музыкі **(тамсама)**.

**19.00 —** «Ідылія» **ў Купалаўскім тэатры**. Перад ёю — урачыстая частка з удзелам нашчадкаў В. Дуніна–Марцінкевіча: Станіслава Плаўскага, Тадэвуша Крыжаньскага, Бэаты–Хрысьціны Марцінкевіч (Польшча).

### Жодзінцы

**6 лютага а 18-й у менскім Палацы мастацтваў (вул. Казлова, 3)** адбудзецца літаратурна–мастацкая імпрэза і адкрыцьцё выставы «Жодзінцы». Удзел возьмуць Аляксей Марачкін, Уладзімер Сіўчыкаў, Аляксандар Ксяндзоў, Валеры Славук, Алесь Аркуш, Мікола Андруковіч, Уладзімер Гладкевіч, Віктар Зайцаў, Мікола Крайко і інш. Выставу, якая экспанавалася ў Жодзіне, Полацку, Наваполацку і рэпрэзэнтавала 20 мастакоў, мяркуецца паказаць яшчэ ў Горках і ў Лагойску.

### Кола часу

**Да 15 лютага ў галерэі NOVA (Веры Харужай, 16) працуе фотавыстава Альберта Цэхановіча** «Кола часу» — своеасаблівае палявое дасьледаваньне будзённага жыцьця беларускай вёскі сярэдзіны 1990–ых — пачатку 2000–ых. Гэта погляд чалавека, які ня першы год шукае адказы на адвечныя пытаньні: хто мы, адкуль мы, куды мы ідзем?

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Мара Касандры»

**Мара Касандры** (Cassandra's Dream)

Вялікабрытанія — ЗША, 2007, каляровы, 108 хв.

**Рэжысэр:** Вудзі Ален

**Жанр:** Драма

**Адзнака:** 7 (з 10)

У двух братоў — картачнага гульца і бізнэсмэна–пачаткоўца — сур'ёзныя фінансавыя праблемы. Па дапамогу героі зьвяртаюцца да свайго дзядзькі. Той згодны дапамагчы, але за гэта патрабуе забіць чалавека…

«Мара Касандры» — гэта Дастаеўскі, пастаўлены ў форме камэрнай лёнданскай драмы. Абмежаваная колькасьць герояў, насычаныя дыялёгі, псыхалягічная глыбіня. Азартны Колін Фарэл — Гулец, Раскольнікаў і Ідыёт у адной асобе; стрымана–дзелавіты брат Эван Макгрэкар, эгаістычны дзядзька Том Ўілкінсан з кароннай фразай «у вас няма выбару».

Выбар заўжды ёсьць.

70–гадовы Вудзі Ален у трагедыйна–лёгкай драме здольны праняць сучасную сытую публіку, задаецца фундамэнтальнымі пытаньнямі: «Ці ёсьць Бог, калі чалавек зьдзяйсьняе злачынствы? Дзе — Божае пакараньне і Божая міласэрнасьць?»

Фінал стужкі шакуе сваёй антычнай няўмольнасьцю. Але на працягу карціны гучалі сьведчаньні, якія сёньняшнія спажывецкія нэапаганцы імкнуцца не заўважаць.

**Андрэй Расінскі**

## «Бэрлібры» Андрэя Хадановіча

7 лютага

ў вялікай залі
Дома літаратара
(вул. Фрунзэ, 5)

Пачатак
а 19.00

Андрэй Хадановіч запрашае на паэтычна–музычную акцыю **«Мэдыюм»**. У праграме прэзэнтацыя кнігі вершаў **«Бэрлібры»** і аўдыёкнігі **«Абменьнік»**. Удзельнічаюць гурты **INDIGA**, **BAND_A**, **Сяргей Пукст**, **Рацыянальная дыета**, **паэты Джэці (Вера Бурлак)**, **Дзьмітры Дзьмітрыеў**, **Максім Жбанкоў**, **Віктар Жыбуль**, **Марыйка Мартысевіч**, **Сяржа Мядзьведзеў**. Уваход вольны. Даведкі: 649–08–88.



## ІМПРЭЗЫ

### Прэзэнтацыя збору твораў Быкава

**6 лютага ў рамках міжнароднай выставы-кірмашу «Кнігі Беларусі 2008»**, якая пройдзе 6—10 лютага ў выставачным цэнтры «БелЭКСПА», адбудзецца **прэзэнтацыя збору твораў Васіля Быкава. Пачатак а 14-й.**

Удзел бяруць удава пісьменьніка Ірына Міхайлаўна, літаратары Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Сяргей Законьнікаў, Алесь Пашкевіч, Уладзімер Някляеў і Міхась Тычына.

Свае стэнды на выставе прадстаўляюць і пасольствы замежных краінаў. Так, на стэндзе амбасады Швэцыі можна будзе паглядзець беларускі пераклад кнігі Астрыд Ліндгрэн «Карлсан–з–даху».

### Эдуард Акулін

**2 лютага ў тэатральнай залі Чырвонага Касьцёлу** пройдзе **творчая вечарына** паэта–барда Эдуарда Акуліна **з прэзэнтацыяй альбому «Песьні Залатой Крывіі»**. У імпрэзе бяруць удзел: Алесь Камоцкі, Ніл Гілевіч, Вольга Іпатава, Леанід Дранько–Майсюк, Кастусь Герашчанка, Анатоль Мяльгуй, Віталь Супрановіч і іншыя. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны. Т.: (029) 649–08–88

### 222 альбомы

**3 лютага ў тэатральнай залі Чырвонага Касьцёлу** пройдзе сустрэча з аўтарамі і героямі **кнігі «222 альбомы беларускага року і ня толькі»**. Удзельнічаюць: Вітаўт Мартыненка, Анатоль Мяльгуй, Лявон Вольскі (NRM), Алег Хаменка («Палац»), Андрэй Плясанаў ( PLAN), Яраш Малішэўскі (Pete Paff), Зьміцер Бартосік ды інш. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны. Т.: (029) 649–08–88

## ТЭАТАР

**Купалаўскі тэатар**
**1 (пт)** — «Ромул Вялікі»
**2 (сб)** — «Чычыкаў»
**3 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж»
**4 (пн), 5 (аўт)** — «Ідылія»
**6 (ср), 7 (чц)** — «Вольга»
**8 (пт), 9 (сб)** — «Вечар»
**10 (ндз)** — «Памінальная малітва»
*ранішія спэктаклі*
**3 (ндз)** — «Афрыка»
**10 (ндз)** — «Сьнежная каралева»
*малая сцэна*
**8 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»
**9 (сб)** — «Маці»

**Тэатар беларускай драматургіі**
**2 (сб)** — «Нязваны госьць»
**3 (ндз)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**5 (аўт)** — «Неба ў дыямэнтах»
**6 (ср)** — «Кабала сьвятошаў».
**7 (чц)** — «Іванаў»
**8 (пт)** — «Сталіца Эраўнд»
**9 (сб)** — «Містэр Розыгрыш»
**10 (ндз)** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**10 (ндз)** — «Адвечная песьня»

**Тэатар юнага гледача**
**9 (сб)** — «Залатое сэрцайка»
**9 (сб)** — «Апошняя дуэль»
**9 (сб), 10 (ндз)** — «Паліяна»

## КАНЦЭРТЫ

### «Рэха» ў Горадні



**У суботу 2 лютага ў Горадні** выступяць з сумесным канцэртам менскі гурт «Рэха» і бард Віктар Шалкевіч. Імпрэзай пачнецца кампанія «Год Незалежнасьці — 2008», прысьвечаная 90-гозьдзю абвяшчэньня БНР. Апроч таго, 2 лютага адзначаецца 170-я гадавіна з дня народзінаў Кастуся Каліноўскага.
Канцэрт пройдзе па адрасе: **вул.Будзённага, 48а**. **Пачатак у 18.00.**

## Трыё Ўлодэка Паўліка



**6 лютага а 19-й Беларуская дзяржаўная філярмонія і Польскі інстытут у Менску прэзэнтуюць канцэрт аднаго з найлепшых польскіх джазавых музыкаў Ўлодэка Паўліка і ягонае трыё. Канцэрт адбудзецца ў Вялікай залі Белдзяржфілярмоніі (пр.Незалежнасьці, 50).**

# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі




**«Горад сонца» не ўвасобіўся ў цэльны горад.**
Піша архітэктар Ігар Байцоў ... 16

**Калі ня будзе вайны, Клінтан мае шанцы.**
Янка Запруднік пра выбары ў ЗША ... 21

**Валёнкі.**
Фотарэпартаж Андрэя Лянкевіча з унікальнага прадпрыемства ... 22

**Што згубіла Радэзію?**
Разважае Ўсяслаў Шатэрнік ... 24

**Незнаёмае праваслаўе.**
Гутарка з Натальляй Васілевіч ... 26

**Партрэт калектыўнага Пуціна.**
Андрэй Расінскі пра сучаснае расейскае кіно ... 28


## КАЛІ Б...

**...беларускія навукоўцы адгукнуліся на заклік дапамагчы росту эканомікі.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**Прафэсар:** Цяпер, дзякуючы нашым распрацоўкам і з дапамогай касьмічнага спадарожніка, кіраўнік зможа дыстанцыйна паскараць разьвіцьцё гаспадаркі.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

І ў Расеі жыцьцё народа і ўсяго гасударства можа зьмяніцца на лепшае толькі тады, калі завядзецца тутака *агульнае навучаньне*, для ўсіх. Толькі гэтаму працівіцца жменя людзей, каторым карысна цемната народная…

**«Наша Ніва». №4. 1908**

«Нашу Ніву» пытайцеся на сядзібе ТБМ кожны будні дзень ад 15.00 да 19.00.




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую са сьвятам** прыхільнікаў творчасьці Рыгора Барадуліна. А.Т.

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: Тарашкевіч «Беларуская граматыка» 1929, К.Акула «Змагарныя дарогі», «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» 1–5 т, Ластоўскі «Гісторыя Беларусі» 1910, Ластоўскі «Расейска–крыўскі (беларускі) слоўнік», «Беларускі кнігазбор»: Чачот, Геніюш, Гётэ, Жылка, Каліноўскі, Баршчэўскі ды шмат іншага. Т.: (029) 753–70–05.

### ЖЫТЛО

**Здам 1 ці 2 пакоі** ў экалягічна чыстым, недалёка ад цэнтру раёне. Пры патрэбе — з прапіскай. Т. (017) 288–05–44. Яўген

**Маладая беларускамоўная сям'я** зь дзіцем 6 гадоў здыме адносна таннае прыстойнае жытло ў Менску альбо пад Менскам (каб часта хадзілі электрычка ці аўтобус). Разглядаюцца ЎСЕ варыянты. Т.:(029) 198–32–51

**Прадам** за 53 т. цагляны дом плошчай 100 кв.м.(зроблены на 70%) з участкам (6 сотак), ля менскай кальцавой. Ёсьць электрычнасьць, вада, падводзіцца газ. Т. (029) 576–74–29

**Здаецца аднапакаёвая кватэра** ў раёне Ўручча прыстойнымі беларускамоўнымі гаспадарамі. Т.: (029) 630–63–26. Валодзя

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** «Замкі Беларусі» 10 лютага (нядзеля) па маршруце: Менск — Мір — Наваградак — Любча — Ліда — Шчорсы — Усялюб — Менск. Т.: (029) 292–54–58, (029) 622–57–20, (029) 509–12–16, (029) 110–19–28


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.


Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 30.01.2008.

Замова № 551.

**Рэдакцыйны адрас:** Ракасоўскага, 102–71.